Беларускае дабраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры

Інстытут гістарычных даследаванняў Беларусі Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта

# Горад святога Губерта

**краязнаўчы альманах**

выпуск IV

пад рэд. А. Смаленчука і А. Вашкевіча.

Горадня – Вільня
2008

63.3 (4Беі)
Г 72

Горад святога Губерта. Краязнаўчы альманах. Выпуск IV. / Пад рэд. А. Смаленчука і А. Вашкевіча. – Вільня: Інстытут гістарычных даследаванняў Беларусі ЕГУ, 2008. – 116 с.

Гэты выпуск альманаха “Горад святога Губерта” працягвае тэму “рэканструкцыі” цэнтра Горадні, якая ўсё больш ператвараецца ў сапраўднае знішчэнне гістарычнай унікальнасці гораду. Выпуск складаецца з дакументальных і аналітычных матэрыялаў, фотаздымкаў.

Альманах адрасаваны ўсім, каго хвалюе як мінулае беларускіх гарадоў, так і іх будучыня.

Рэдкалегія

А.Смалянчук, доктар гістарычных навук (Горадня) – рэдактар.
А.Краўцэвіч, доктар гістарычных навук (Горадня);
А.Чарнякевіч, кандыдат гістарычных навук (Горадня);
Я.Мілеўскі, доктар гісторыі (Беласток);
Р.Мікныс, доктар гісторыі (Вільня);
А. Вашкевіч, аспірант (Горадня).

**У афармленні вокладкі выкарыстаны эскіз ветраніка працы Юрася Мацко**
У падрыхтоўцы выпуску выкарыстаны матэрыялы сайту www.harodnia.com

skład i łamanie lve



# Святы Губерт

Паводле жыццяпісаў, святы Губерт нарадзіўся каля 655 г. у сям'і князя Аквітаніі. Існуе легенда, што яшчэ ў маладыя гады на паляванні ён сустрэў аленя з крыжам паміж рагамі, які сказаў яму, каб ён пакінуў вясёлае і разгульнае жыццё і стаў служыць Госпаду. Губерт паслухаўся, стаў вучнем маастрыхцкага біскупа Ламберта і яго пераемнікам. Каля 704 г. ён узначаліў біскупства, якое на палову было язычніцкім. Біскуп Губерт прысвяціў сваё жыццё пашырэнню хрысціянства. Ён памёр у 728(?) і быў пахаваны ў Льежы. Калі праз 16 гадоў труну адкрылі, то ўбачылі цела, некранутае распадам.

Культ святога Губерта, які лічыўся апекуном паляўнічых, хутка пашырыўся па ўсёй Еўропе. Не былі выключэннем і беларускія землі. Іканаграфія найчасцей паказвае святога Губерта ў час палявання, калі перад ім з'явіўся алень з крыжам.

У 1496 г. вялікі князь Аляксандр дараваў Горадні магдэбургскае права. Горад атрымаў магчымасць мець свае органы самакіравання і ўласны герб. Гарадзенцы згадалі пра святога Губерта, і паўлегендарная гісторыя адлюстравалася на гербе: у блакітным полі алень з залатым крыжам пераскоквае праз агароджу. Блакіт герба сімвалізаваў прыгажосць, мяккасць і лагоднасць. Залаты колер – сімвал справядлівай улады. Усе разам азначала росквіт горада. Апроч таго выява аленя, які пераскоквае праз агароджу, сведчыла пра вольналюбівы характар Горадні, пра імкненне гараджанаў быць свабоднымі і незалежнымі.

Герб вярнуўся да нас толькі ў 1990 г.



# Прадмова

Пайшоў трэці год чыноўнай "рэканструкцыі" Горадні. Горад прыкметна змяніўся. За гэты час у нас стала значна больш дарогаў і стаянак для транспарту. На дахах некаторых будынкаў у "старым горадзе" заззяла бардовая металадахоўка, а іх фасады выразна абнавіліся ў выніку рамонтных працаў. Савецкая плошча з утульнага куточку горадуператварылася ў бетонную пляцоўку для правядзення "масавых мерапрыемстваў".

Заканчваецца рэканструкцыя "старога мосту", якая дазволіць значна павялічыць яго прапускную здольнасць, і адначасна прывядзе да павялічэння патоку транзітнага аўтатранспарту праз гістарычны цэнтр.

Былі разбураныя некалькі будынкаў "старога гораду". Знішчэннем рэштказў флігеля канца XVIII ст. (вул. Горкага) пачаўся наступ экскаватараў на ўнікальны для краіны гарадзенскі "Новы свет" першай трэці XX ст.

Па ўсяму гораду адбываецца пілаванне дрэваў, якія ўпрыгожвалі вуліцы і плошчы, давалі цень і пачуццё утульнасці. Замест традыцыйных беларускіх гатункаў высаджваюцца імпартныя нізкарослыя дрэўцы або выкладваецца плітка. Замілаванне мясцовай бюракратыі да пліткі цяжка растлумачыць рацыянальна. Хоць, магчыма, гэта якраз той выпадак, пра які нашыя польскія суседзі гавораць: *Kiedy niewiadomo o co chodzi, chodzi o pieniądze...*

2008 будаўнічы год працягваецца... Усё больш відавочнымі становяцца новыя "болевыя кропкі" – "Новы свет"; Стары замак; Каложская (Барысаглебская) царква; будаўніцтва дарогі ў рэчышчы Гараднічанкі (дублёр вул. Вялікай Траецкай). Менавіта гэтым раёнам гораду прысвечаныя матэрыялы чацвёртага выпуску альманаха "Горад святога Губерта".

Вопыт "рэканструкцыі" 2006 – 2008 гг. паказаў наколькі небяспечным з'яўляецца адсутнасць прававога рэгулявання "рэканструкцыі". Можна канстатаваць, што Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" ў Горадні не выконваецца. Па-ранейшаму, улады не жадаюць ісці на дыялог з грамадскасцю гораду, занепакоенай маштабнасцю планаў і відавочным рэстаўрацыйным і гістарычным невуцтвам іх рэалізатараў.

У сённяшніх умовах найлепшым варыянтам для гісторыка-культурнай спадчыны Горадні з'яўляецца не "рэканструкцыя", а кансервацыя і захаванне таго, што не знішчылі ні войны, ні камуністычныя чыноўнікі, ні экскаватары першых гадоў "рэканструкцыі па-гарадзенскі".

Рэдакцыя

# “Новы свет” Горадні

**Таццяна Казак, Андрэй Вашкевіч (Горадня)**

*Больш чым 130 гадоў прайшло з таго часу, калі на выкупленых у князёў Друцкіх-Любецкіх землях маёнтку Станіслававова ўзнік раён горада, які атрымаў назву “Новы свет”. Ціхія вулкі, маленькія, але вельмі прыгожыя драўляныя і цагляныя асабнякі, непаўторны дух правінцыйнага, але ганарыстага сваім мінулым горада...*

*Сёння “Новы свет” – гэта адзін з найбольш арыгінальных і захаваных раёнаў нашага горада, куды ўжо таксама дабраліся экскаватары “рэканструктараў”. Гарадзенскі “Новы свет” – гэта матэрыяльнае ўвасабленне нашай гістарычнай талерантнасці і цярпімасці, якой мы так ганарымся перад суседзямі. Таксама, як сёння на вулках “Новага свету” адзін каля аднаго стаяць будынкі, пабудаваныя пад уплывамі самых розных архітэктурных стыляў, так калісьці жылі ў “Новым свеце” людзі розных нацыянальнасцяў, якія нарадзіліся ў нашым цудоўным горадзе або суровымі вятрамі гісторыі былі сюды закінуты.*

*Беларусы Янушкевічы, Федарукі і Багдановічы, палякі Цыпельты, Вайцяхоўскія і Астроўскія, рускія Маісеевы і Кірылавы, габрэі Канэлі і Маламеды, татары Маслоўскія і Мількамановічы, украінцы Гуменюкі, немцы Фалендорфы... Усім ставала тут месца, усе былі сябрамі і добрымі суседзямі, дзеці якіх гулялі разам.*

*Можаце ўявіць сабе такі дыялог паміж жыхаром “Новага свету” і нейкім прыезджым, які трапіў на гэтыя вулкі гадоў семдзесят таму:*

*– А хто тут жыве ў гэтым “Новым свеце”?*

*– Як хто?! Розныя людзі. У гэтым асабнячку, пабудаваным у сучасным стылі канструктывізма, жыве рускі белаэмігрант. У тым неабарочным доміку сям’я старой беларускай татарскай шляхты. У тым цагляным, праз вуліцу, бачыце, з прыгожымі дзвярыма ў стылі “мадэрн”, трымае пекарню габрэйскі прадпрымальнік. А вось у гэтым драўляным з цагляным брандмаўэрам, з цудоўнымі разнымі ліштвамі і ганкам жыве вядомы інжынер, паляк, які прыехаў у наш горад аднекуль з-пад Кракава.*




**“Новы свет” на плане Горадні 1892 г.**

*– А беларусы?*

*– А беларусаў і палякаў, з мясцовых, тут не злічыць.*

Назва раёну “Новы свет” прыйшла да нас з XIX ст. Яго нараджэннем можна лічыць 24 чэрвеня 1875 г., калі прадмесце “Новы свет” стала часткай гарадской тэрыторыі[1].

Перад Першай сусветнай вайной “Новы свет” займаў вялікую тэрыторыю, якая ахоплівала частку горада на поўнач ад вуліцы 1 мая і да сучаснай вуліцы 17 верасня. Тады быў забудаваны толькі паўднёвы бок гэтай вуліцы.

Паміж 1915 і 1920 гг. будаўніцтва ў горадзе і ў тым ліку на “Новым свеце” не вялося. Паводле карты 1928 г., паўночнай мяжой “Новага свету” была вуліца Панятоўскага (зараз вул. Астроўскага). На гэтай жа карце на поўнач ад вул. Астроўскага абазначана “Залатая горка”. Гэты тапонім распаўсюджваўся таксама на раён

будынкаў паміж вуліцамі Астроўскага і 17 верасня і да вул. Горкага, якія былі знесены ў жніўні-верасні 2006 г. Аднак пазней "Новы свет" працягваў павялічвацца. Паводле карты 1937 г., на поўнач ад вул. Астроўскага цягнуліся вуліцы Рэйманта і Славацкага. Там былі пабудаваныя шматлікія драўляныя і каменныя дамы гараджан, а таксама некалькі камяніцаў для сем'яў польскіх афіцэраў. Была збудаваная таксама спартыўная пляцоўка, дзе трэніраваліся польскія вайскоўцы-спартсмены. Сярод іх былі і будучыя ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў.

Такім чынам у канцы 1930-х гг. завершылася фарміраванне "Новага свету", якое працягвалася больш чым палову стагоддзя. "Новы свет" ахопліваў раён сучасных вуліцаў 1 мая, Акадэмічнай, Багдановіча, Валковіча, 17 верасня, Дзяржынскага, Астроўскага, Рэйманта, Розы Люксембург, Славацкага, Ватуціна, Горкага, Міцкевіча, Бялінскага. На поўначы ён межаваў з адным з найбольш цікавых гістарычных раёнаў Горадні – "Гарадніцай", забудаванай у часы Антонія Тызенгаўза.

У экспазіцыі гарадзенскага Дома-музея Максіма Багдановіча можна ўбачыць канверт з адрасам: "гор. Гродна, Новы свет, дом Агульнікава". Гэты канверт быў дасланы з Галоўнага дэпо музычных інструментаў у Пецярбурзе. Яго атрымала маці паэта Марыя Апанасаўна Багдановіч. Яна займалася музыкай, і ў гэтым канверце ёй перасталі нотныя запісы для ігры на фартэпіана.

Яшчэ адно сведчанне XIX ст. пра "Новы свет" можна знайсці ва ўспамінах Адама Ягоравіча Багдановіча[2], дзе ён паведамляе аб месцы жыхарства сваёй сям'і пасля пераезду ў Горадню ў 1892 г.: "Жили мы на окраине города, на Новом свете по Садовой, занимали квартиру в последнем доме слева. Дома в то время шли после имения Станиславова"[3]. Такім чынам, спачатку "Новы свет" – з'яўляўся былой прывакзальнай часткай Горадні, у якую ўваходзіла і Садовая вуліца (зараз вул. Элізы Ажэшкі)[4].

Пра выгляд пачатковай забудовы вуліц Грандзіцкай і Міцкевіча можна даведацца з дакументаў Дзяржаўнага архіву Гродзенскай вобласці[5]. Так, у 1923 г. на вуліцах можна было ўбачыць у асноўным драўляныя будынкі 1890-х гг., але таксама і мураваныя, узведзеныя ў першым дзесяцігоддзі XX ст.

"Новы свет" набывае асаблівы выгляд ў 20-30-я гг. Менавіта ў гэты час у Горадні будуюцца жылыя дамы ў стылі канструктывізму, з характэрным для яго імкненнем да максімальнай выразнасці і эканамічнасці формаў, да агалення іх тэхнічнай асновы[6]. Адной з



**“Новы свет” на плане Горадні 1937 г.**

галоўных рысаў канструктывізма было стварэнне зручнага і камфортнага жылля. У Беларусі захавалася не шмат архітэктурных аб’ектаў, пабудаваных у гэтым стылі. А наш горад яшчэ мае ўнікальны раён, дзе захаваліся помнікі мураванага і драўлянага канструктывізму. Напрыклад, будынак № 15 па вул. Астроўскага (Аддзяленне эндакрыналогіі) ці жылы дом № 16 па вул. Рэйманта. Гэтыя будынкі з’яўляюцца помнікамі архітэктуры, пакуль не прызнанымі Міністэрствам культуры.

Вялікую цікавасць уяўляюць помнікі мураванага будаўніцтва тых часоў. Гэта дагледжаныя дамы, акружаныя зелянінай, якія ствараюць добрае ўражанне ў першую чаргу сваім эканомным і функцыянальна прадуманым планам. Сціпласць канструктывісцкіх формаў тут не падаецца аскетычнай. Такія дамы мы можам убачыць на вуліцах 17 верасня і Бялінскага. Вялікай стратай для “Новага свету” і ўсёй гарадзенскай архітэктуры стаў знос дома № 29 па вул. Горкага. Ён быў знесены восенню 2006 г., аднак паспеў патрапіць у вядомыя навуковыя выданні, як каштоўны архітэктурны помнік рэспубліканскага маштаба[7].

Дамы ўзводзіліся не толькі ў стылі канструктывізму. Яны таксама ўтрымліваюць неабарочныя рысы (жылы будынак № 12 па вул. 17 верасня), а таксама неакласічныя (дамы №№ 18 і 24 па вул. Рэйманта). Трэба адзначыць, што захаваліся не толькі будынкі, але і дэкаратыўныя элементы тых часоў – упрыгожванні вокнаў, дзверы, ручкі, дэкор фасадаў.

У "Новым свеце" знаходзіцца цэлы шэраг унікальных як для Горадні, так і для ўсёй Беларусі драўляных будынкаў, пабудаваных у стылі так званага "рускага мадэрна". Гэта багата аздобленыя драўлянай разьбой будынкі №№ 13, 15, 17 па вул. 17 верасня, №№ 7,9 па вул. Міцкевіча, №№ 4, 9 па вул. Бялінскага, якія ў канцы XIX ст. былі драўлянымі асабнякамі заможных гараджанаў, што набывалі зямельныя ўчасткі і будавалі дамы на ўскрайку горада.

Аблічча горада вызначае не толькі архітэктура, але і тыя людзі, што жылі ў "Новым свеце". Гэта інжынер Высоцкі, беларускі настаўнік Федарук, палітычны дзеяч Сяргей Прытыцкі, лекар Беклемішаў, паэт Максім Багдановіч, а таксама шматлікія ўладальнікі крамаў, майстэрняў, аптэк. Усе гэтыя людзі заслугоўваюць памяці сучасных гараджанаў. Яны таксама былі часткай гісторыі "Новага свету" і нашага гораду. Адпаведна вельмі важным для вывучэння "Новага свету" з'яўляецца збор успамінаў людзей, якія могуць апісаць раён і горад ранейшых часоў.

"Новы свет" – гэта адметны гістарычны і архітэктурны раён Горадні, які патрабуе аховы і даследавання. Трэба захаваць гэты раён, які і па сённяшні дзень з'яўляецца непаўторнай часткай архітэктурнага аблічча горада. **Неабходна прыняць меры па яго захаванню і надаць многім будынкам "Новага свету" статус помнікаў архітэктуры, а сам раён уключыць у межы гістарычнага цэнтра нашага горада.** Разбурэнне "Новага свету" прывядзе да таго, што горад страціць арыгінальную і найбольш зялёную частку гістарычнага цэнтра.

---

[1] Орловский Е. Гродненская старина. Часть 1. Гродно: Губернская типография, 1910. С. 313.

[2] Богданович А. Материалы к биографии Максима Адамовича Богдановича / Шлях паэта. Успаміны і біяграфічныя матэрыялы пра Максіма Багдановіча. Мн., 1975. С. 20.

[3] Тамсама.

[4] Тамсама. С. 301.

[5] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобл. (ДАГВ). Ф. 46, воп. 1, ад. з. 50.

[6] Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. Мн.: БелЭн, 2002. С. 273.

[7] Шамрук А. С. Архитектура Беларуси XX – начала XXI веков. Минск, 2007. С. 83.

# Перспектывы драўлянага гістарычнага цэнтру Горадні

**Сцяпан Стурэйка (Горадня)**

Хацелася б назваць артыкул “Новы драўляны цэнтр Горадні”, але ж “Новы свет” існуе ўжо даўно. Справа ў тым, што толькі цяпер перад пагрозаю знішчэння ён пачаў успрымацца як частка традыцыйнага гістарычнага цэнтру, толькі ў альтэрнатыўнай драўлянай форме. Варта нагадаць, што ў 2006 г. быў разбураны цэлы квартал “Новага свету” – “Залатая горка”. Плануецца знішчэнне шэрагу іншых дамоў.

Між тым гэты раён адметны тым, што дайшоў да нашага часу амаль некранутым з пачатку XX ст. Пра яго гістарычную вартасць шмат пісалася ў Інтэрнэце (www.harodnia.com) і, здаецца, вартасць гэтую ніхто не аспрэчвае, але яна не з’яўляецца пераканаўчай. Гледзячы на старыя дамы, некаторыя з якіх ня маюць дасюль некаторых гарадскіх выгодаў, гарадзенцы здзіўляюцца: што за блазнота прымушае актывістаў марнаваць свае сілы на абарону гэтага “прыватнага сектару”?

Мэта дадзенага артыкула – даказаць культурную і горадабудаўнічую вартасць “Новага свету”.

Зробім мы гэта наступным чынам: па-першае, акрэслім гісторыю пытання пра захаванне забудовы падобнага тыпа і, па-другое, паспрабуем пафантазіраваць на аснове прыкладаў з далёкага ды блізкага замежжа, як можна было б паступіць з “Новым светам”, як выкарыстаць яго патэнцыял на карысць гораду. Адразу заўважым, што гаворка тут будзе весціся не пра шэдэўры драўлянай архітэктуры кшталту ансамбля ў Кіжах ці гарадзенскага Лямуса, але пра шэраговую, масавую забудову, якую гаспадары ўсё яшчэ выкарыстоўваюць па прамым прызначэнні.

### Чым жа адметны “Новы свет” для Горадні з пункту гледжання тэорыі культурнай спадчыны?

Галоўная архітэктурная ўнікальнасць “Новага свету” заключаецца ў тым, што складаецца раён пераважна з драўлянай забудовы. Гэта менавіта гарадская драўляная забудова, а не інкарпарыраваная ў горад вёска. Звычайнай і нават сумнай гэтая яскравая рыса цэнтру



**Вул. 17 верасня, д. 8. Былая пякарня Любэга**

нашага цудоўнага гораду можа падацца толькі тым яго насельнікам, якія ніколі не выязджалі далёка за межы рэспублікі (я маю на ўвазе не абшары СНД, але Заходнюю Еўропу). Так ужо атрымалася, што гістарычна ў Заходняй Еўропе ўзровень жыцця нашмат вышэйшы. Так яно ёсць цяпер, так было і 100, і 200 і 300 гадоў таму. Адпаведна насельніцтва багацейшае, мае большыя магчымасці. Нягледзячы на тое, што пачынаючы ад сівой даўніны, ад самога ўзнікнення сярэднявечных буйных агароджаных паселішчаў, драўніна па ўсёй Еўропе (ды што там – па ўсім свеце!) з'яўлялася найбольш пашыраным будаўнічым матэрыялам, як у сельскай мясцовасці, так і ў гарадах, зразумела, што каменнае ды цаглянае будаўніцтва заўсёды лічылася больш трывалым, адпаведна было больш дарагім. Хто быў багацейшы без усялякага сумнення ламаў свае драўляныя дамы ды будаваў цагляныя. Але паўсюдна драўніна ў гарадах трымалася да пачатку XX ст. З 1930-х гг. існаванне драўлянай забудовы ўступіла ў канфлікт з новымі ідэаламі ў цагляным будаўніцтве. Вытворчасць цэглы да таго ж станавілася ўсё больш таннай.

Драўніна прайграла таксама ў сувязі з пажарнай небяспекай (хоць з канца XIX ст. пажары былі ў асноўным узятыя пад кантроль добра экіпіраванымі гарадскімі пажарнымі дружынамі). Сярэдзіна XX ст. стала часам росквіту "вольнай Еўропы", перш за ўсё росквіту

матэрыяльнага. Драўляныя дамы канчаткова саступілі цагляным нават у сельскай мясцовасці. Гэта асабліва добра бачна, калі на аўтобусе вы паедзеце з Беларусі, напрыклад, у Чэхію. Чым далей на захад, тым радзей у прыгарадах ды вёсках трапляюцца ў поле зроку драўляныя хаткі, тым больш гаспадарчую, а не жылую функцыю яны выконваюць. Пад Вроцлавам (да 1945 г. належаў да Нямеччыны) драўляныя дамы выглядаюць ужо зусім экзатычна, і бачна як асабліва руплiва ставяцца да іх гаспадары.

Да сярэдзіны XX ст. – часу паўстання ЮНЭСКА і часу небывалага развіцця тэорыі гісторыка-культурнай спадчыны – сельская і гарадская драўляная забудова захавалася толькі ва Усходняй ды Паўночнай Еўропе, гэта значыць у Польшчы, Беларусі, Украіне, Расіі, Літве, Латвіі, Эстоніі, Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі (у апошніх не столькі з-за нізкага ўзроўню жыцця колькі з-за больш глыбокіх «лясных» традыцый). Моцным ударам для гарадской драўлянай спадчыны сталіся абнаўленні гарадской забудовы, што мелі месцы амаль паўсюдна ў 1960–70-я гг. Якраз тады вялікая частка драўлянага гарадскога асяроддзя, што яшчэ захоўвалася, была зліквідаваная. Навык канструкцыі драўляных дамоў канчаткова згубіў вартасць. Урбанізацыя, індустрыялізацыя і глабалізацыя выліліся ў хуткую змену традыцый грамадства. Высокія кошты на зямлю ды развіццё гарадоў наклала вялікі адбітак і на гістарычныя прыгарадныя тэрыторыі. Гэты фактар дастаўся нам у спадчыну з апошніх дзесяцігоддзяў XIX ст., калі было пашыранае меркаванне, што драўляныя дамы з'яўляюцца прыкметай беднасці ды безгустоўнасці.

А вось у нашым горадзе захаваўся цэлы гарадскі комплекс, які адрозніваецца ад сельскага цалкам іншай планіровачнай структурай ды канструктыўнымі асаблівасцямі дамоў! Больш за тое – у нас гэта дамы, што пабудаваныя ў стылі **драўлянага канструктывізму**. Наогул вельмі рэдкая сёння з'ява.

Менавіта ў 60-я гг. XX ст. Еўропе на хвалі глабалізацыі ды ўсведамлення неабходнасці захавання сваёй культурнай адметнасці канцэпт "культурная спадчына" і быў распаўсюджаны на драўляную забудову. Дзякуючы большай інтэлектуальнай свабодзе і агульнаеўрапейскаму далягляду працэсы захавання драўлянай спадчыны былі ініцыяваны ў Паўночнай Еўропе. Супрацоўніцтва паміж Фінляндыяй, Нарвегіяй і Швецыяй у захаванні паўночных драўляных гарадоў пачалося на пачатку 1960-х гг. Вынікам стала распрацоўка методыкі класіфікацыі ды кансервацыі гарадской

спадчыны спецыяльна для некалькіх канкрэтных драўляных гарадоў.

Так, за працу па кансервацыі свайго драўлянага гістарычнага цэнтру і "адметную рэстаўрацыю ўсяго драўлянага горада з захаваннем арыгінальнага аблічча і духа" г. Хйо ў Швецыі быў у 1988 г. узнагароджаны медалем уплывовай міжнароднай арганізацыі "Еўропа Ностра", што спецыялізуецца ў галіне захавання спадчыны.

Вопыт заходніх ды паўночных краін Еўропы ў стаўленні да будучыні драўлянай забудовы досыць вялікі, рознабаковы ды павучальны. Драўляныя раёны шматлікіх вялікіх еўрапейскіх гарадоў, сярод якіх Хельсінкі, Капенгаген і Берлін моцна пацярпелі ад хвалі мадэрнізму, калі старыя, драўляныя дамы былі знесены і на іх месцы пабудаваныя цагляныя. Прыбалтыйскія краіны і Польшча першымі ўспрынялі новыя еўрапейскія культурныя каштоўнасці. Іх драўляную спадчыну ад праяў мадэрнізму захавала "жалезная заслона". Гэтыя краіны здолелі пазбегнуць памылак іншых.

Дасягненні ў захаванні драўляных гарадоў і культурных ландшафтаў балтыйскіх краінаў вылілiся ў паўночна-балтыйскае супрацоўніцтва кансерватараў у 1997–2000 гг. Для абмеркавання праблемы запаўнення гістарычнай гарадской прасторы і вытлумачэння культурнай вартасці драўляных пабудоў у гарадскім асяроддзі ў Прыбалтыйскіх краінах была праведзена серыя спецыяльных канферэнцый.

У 2000 г. па ініцыятыве Групы па маніторынгу культурнага супрацоўніцтва ў Балтыйскім рэгіёне была створана працоўная група "Жыццяздольныя гістарычныя гарады". Яе структура і абавязкі ўдзельнікаў былі заснаваны на сетцы, сфарміраванай Паўночна-балтыйскім супрацоўніцтвам драўляных гарадоў. Старшынства прыпадала на Нацыянальны камітэт па даўніне Фінляндыі сумесна з Нацыянальным камітэтам па спадчыне Эстоніі. Сябрамі арганізацыі сталі эксперты з нацыянальных ды рэгіянальных органаў па ахове спадчыны з Даніі, Латвіі, Літвы, Нарвегіі, Польшчы ды Швецыі.

За мінулы час было распрацавана пад наглядам ЮНЭСКА некалькі спецыяльных праграмаў па захаванні ды папулярызацыі драўлянай спадчыны. Яны прымаюцца ды ўвасабляюцца ў жыццё ў гэтых краінах у цесным супрацоўніцтве з ІКАМОСам. Праграмы – нацыянальныя ды рэгіянальныя – падтрымліваюцца серыяй вялікіх тэматычных навуковых праектаў і правядзеннем адпаведных даследчыцкіх форумаў, што закранаюць праблематыку драўляных

канструкцый у гарадской і сельскай мясцовасцях. Пры гэтым вырашаюцца праблемы ад забеспячэння сацыяльнай падтрымкі захавання да выпрацоўкі адпаведных кансервацыйных тэхналогій для драўніны. На выкананне праграмаў ЮНЭСКА выдаткоўвае вялікія грошы, большасць якіх прызначана для Усходняй Еўропы.

Нарэшце, 7 верасня 2001 г. у Рызе ў выніку правядзення міжнароднага форуму кансерватараў была прынята агульная дэкларацыя "Драўляная архітэктура ў гарадах". Ужо прыгаданая агульнаеўрапейская федэрацыя аховы спадчыны "Еўропа Ностра" сабрала на той форум больш за 200 няўрадавых арганізацый, што займаюцца аховай спадчыны.

З улікам таго, што драўляная архітэктура і драўляныя гарады з'яўляюцца адным з найбольшых унёскаў Паўночнай Еўропы ў сусветную культурную спадчыну, канферэнцыя адзначыла, што драўляная архітэктура забяспечвае неабходную якасць жыцця, пачуццё гісторыі ды ў пэўнай ступені спрыяе выхаванню прыналежнасці гараджанаў да грамадзянскай супольнасці. Таксама адзначалася, што сучасная логіка развіцця гарадоў не забяспечвае ўзнаўлення традыцыйнай драўлянай забудовы, якая ёсць вітальнай крыніцай для фарміравання гарадской ідэнтычнасці. Міжнародны форум яшчэ раз абвясціў неабходнасць падтрымкі народных традыцый будаўніцтва з боку дзяржаўных органаў. Разам з тым падтрымка можа быць аказана і сусветнай супольнасцю, якая зацікаўлена ў захаванні культурных адрозненняў, тым больш што кожная дзяржава рэгіёну павінна разумець сацыяльныя і эканамічныя выгоды падтрымання драўлянага архітэктурнага сектару. Такім чынам, дэкларацыя была скіраваная да ўрадавых структур, няўрадавых арганізацый рэгіёну, каб яны забяспечвалі падтрыманне традыцыі драўлянага будаўніцтва, а таксама прыкладалі высілкі да захавання наяўных прыкладаў драўлянай забудовы.

Да захавання драўлянай спадчыны паўсядзённага ўжытку падключылася і Расія. У верасні 2006 г. у Петразаводску прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Забытая спадчына: як захаваць помнікі драўлянай архітэктуры Расіі". На канферэнцыю прыехалі дэлегаты з расійскіх дзяржаўных і няўрадавых установаў, што займаюцца праблемамі культуры наогул і аховай спадчыны ў прыватнасці. Таксама былі госці з Нарвегіі, Швецыі, Фінляндыі, Польшчы, Украіны. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні захавання гістарычнай драўлянай гарадской забудовы ды

праблемы захавання помнікаў драўлянай архітэктуры ў расійскіх рэгіёнах, практычныя пытанні рэстаўрацыі, шляхі захавання сельскага традыцыйнага гісторыка-культурнага асяроддзя і г.д.

Нягледзячы на развіццё тэорыі ў напрамку аховы драўлянай спадчыны, яшчэ не паўсюль яна ахоўваецца належным чынам. Так, у Вільні да гэтага часу ў спісе аб'ектаў нерухомай спадчыны толькі 10 драўляных дамоў. Тое ж, што адбываецца з драўлянай архітэктурай у Расіі ўражвае не толькі спецыялістаў, але і далёкіх ад спецыфічных навуковых тэмаў людзей. Так, летам 1997 г. у Архангельскай вобласці пажарам быў знішчаны цудоўны архітэктурны ансамбль XVII–XIX стст. у сяле Верхняя Мудзюга. Амаль адразу пасля заканчэння кансервацыйных работ Уваходаерусалімская (XVII ст.) ды Ціхвінская (XIX ст.) цэрквы разам са званіцай (XVIII ст.) згарэлі на працягу двух гадзін падчас навальніцы. У верасні 2000 г. адбыўся пажар Новаерусалімскага манастыра пад Масквой. Ад замыкання электраправодкі згарэла царква Богаяўлення (XVII–XVIII стст.), перавезеная з сяла Сямёнаўскага Пушкінскага раёна. У 2002 г. у розных месцах Расіі ад полымя пажараў загінулі вядомыя помнікі: у Якуцке згарэла вежа астрога (1683 г.), у Кастраме – Спаса-Прэабражэнская царква (1713 г.) з сяла Спас-Вежы, у Ніжнім Ноўгарадзе – царква Покрыва Маці Божай (1731 г.) з сяла Старыя Ключышы[1].Адна з апошніх стратаў здарылася ў жніўні 2006 г., калі абрынуўся шмат'ярусны храм Раства Багародзіцы (1783 г.) у в. Папоўка Валагодскай вобл.

Зразумела, што шэраговая драўляная забудова ў сельскай мясцовасці і ў гарадах масава ідзе пад знос і ў Беларусі, і ў іншых усходнееўрапейскіх краінах, хаця нават у Беларусі існуюць добрыя прыклады яе аховы ў першародным функцыянальным выглядзе. Маецца на ўвазе г. Заслаўль.

**Але як захаваць драўляную архітэктуру?**

Існуюць тры прынцыповых методыкі:

**Захаванне аб'ектаў на месцы – in situ.**

Як правіла, калі гаворка не ідзе пра ператварэнне канкрэтнага дома ці групы дамоў у музей, абмежаваць ахоўную актыўнасць толькі кансервацыяй немагчыма. Гэта натуральна, бо драўляныя пабудовы выкарыстоўваюцца грамадзянамі ў жылых і гаспадарчых мэтах. Безумоўна, з часу свайго стварэння жылыя дамы павінны былі перажыць значныя ўдасканаленні сваіх канструкцый: з'явіліся сучасныя прыбіральні, праводзіліся газ, вада, электрычнасць і г.д.

Таму захаванне ў чыстым выглядзе – мала распаўсюджаная з'ява і хутчэй абстракцыя, бо нават музеефікаваныя дамы перажываюць некаторыя змены. Хутчэй тут можна гаварыць пра стратэгію "ўстойлівага развіцця", асабліва ў дачыненні да комплекснай забудовы.

Гарадзенцам быў бы прыдатны вопыт ўзгаданага драўлянага швецкага горада Хйо. Увесь час яго існавання – раней і цяпер – у ім будуюцца новыя дамы. Горад не застыў у часе, не з'яўляецца музеем і з цягам часу змяняецца. Аднак адміністрацыя лічыць вельмі важным, каб новыя пабудовы дакладна траплялі ў дамінуючую стылістыку з папраўкамі на новыя архітэктурныя тэндэнцыі і сучасныя матэрыялы. Гараджанаў не заахвочваюць будаваць выключна копіі старых дамоў. Галоўнай адметнасцю кожнага індывідуальнага праекта з'яўляецца захаванне стылістычнага духу Хйо і яго развіццё. Часцяком для пераабсталявання старых дамоў выкарыстоўваюцца аўтэнтычныя матэрыялы і архітэктурныя дэталі. У выніку мэтай з'яўляецца не толькі захаванне індывідуальных дамоў адметных сваім знешнім выглядам ці даўнінай пабудовы, але захаванне цэлага горада як сістэмы ўзаемаадносінаў усіх яго элементаў.

Праблемай з'яўляецца захаванне вялікай масы звычайных жылых гаспадарчых пабудоў актыўнага штодзённага выкарыстання, што складаюць аснову ўсіх частак гораду і яго наваколля. Яны таксама з'яўляюцца аб'ектамі культурнай спадчыны, хоць ніколі не будуць быць пературованы ў музеі. Шведскія архітэктары ставяцца да іх захавання, як да элемента планавання развіцця горада. Папершае, пытанні захавання спадчыны заўсёды аналізуюцца пры распрацоўцы праектаў забудовы новых тэрыторый. Па-другое, планаваць развіццё асобных раёнаў прыходзіцца з улікам таго, што наяўная забудова не павінна быць знішчана ці перасунута.

Іншы, больш блізкі для Беларусі і больш адпаведны для Горадні прыклад – захаванне драўлянай спадчыны ў Латвіі. Знакаміты балтыйскі курорт і фестывальны горад Юрмала з'яўляецца фактычна драўляным горадам. Амаль выключна драўляныя дамы стаяць на яго цэнтральнай пешаходнай вуліцы. У драўляных дамах месцяцца дарагія рэстараны і буцікі з вопраткай знакамітых фірмаў. Дамы пабудаваныя ў мясцовай стылістыцы, але некаторыя ўсё ж нагадваюць гарадзенскія з "Новага свету" ці "Заваршчызны". У іх адсутнічаюць шклопакеты, пластыкавыя дзверы, сайдынг, металапрофіль і г.д.

Унікальная драўляная архітэктура Рыгі з'яўляецца часткай прывабнасці горада, як і часткай гарадской ідэнтычнасці. Яна



**Драўляны дом 1936 г. пабудовы на скрыжаванні вул. Славацкага і Люксембург**

стала адной з галоўных падставаў уключэння гістарычнага цэнтру Рыгі ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Па колькасці драўлянай забудовы Рыга займае першае месца сярод усіх еўрапейскіх сталіц. Напрыклад, на вул. Калнчыема месцяцца 34 драўляныя дамы, унікальная калекцыя жылых пабудоў з другой паловы XIX ст. Большасць драўляных дамоў пабудаваныя ў стылі позняга класіцызму з прадуманымі дэталямі ды ідэальнымі прапорцыямі. Яны былі створаныя выбітнымі рыжскімі архітэктарамі свайго часу. Такі тып архітэктурнага ансамблю з'яўляецца досыць рэдкім у Еўропе, таму ўспрымаецца ўладамі Рыгі ў якасці нацыянальнага скарбу. У другой палове XX ст. – у савецкія часы – драўляныя дамы на вул. Калнчыема былі нацыяналізаваны і большасць з іх ператварылася ў камунальнае жыллё. На жаль, сучасны тэхнічны стан гістарычных будынкаў на гэтай вуліцы ў большасці выпадкаў пакідае жадаць лепшага. На працягу мінулых 50 гадоў гэтыя будынкі эксплуатаваліся не зважаючы на неабходнасць іх захавання. Для іх далейшага існавання горад цяпер павінен прыкласці шмат намаганняў, правесці вялікую кансервацыйную і рэстаўрацыйную працу.

Гэтым пытаннем займаецца не толькі Гарадскі савет Рыгі, але і няўрадавыя арганізацыі. Асноўнымі мэтамі іх дзейнасці з'яўляюцца:

– рэстаўрацыя будынкаў на вуліцы;

– рэвіталізацыя самой вуліцы і прылеглых тэрыторый, паляпшэнне інфраструктуры ды ўмоў пражывання насельнікаў;

– актыўнае прыцягненне да гэтай справы мясцовых жыхароў, фарміраванне лакальнай грамадскай супольнасці.

Гэтыя мэты адлюстроўваюць філасофію ўсяго праекту: узнаўленне будынкаў праводзіцца ў кантэксце сацыяльнага і гарадскога асяроддзя. Вопыт іншых заходніх краін, іншых падобных праектаў паказвае, што без удзелу ўраду і мясцовага самакіравання рэнавацыя драўляных дамоў застаецца прэрагатывай толькі заможных гараджан. У выніку горад атрымоўвае шматслойнае аблічча адпаведна матэрыяльнаму стану домаўладальнікаў. Змяшанае сацыяльнае асяроддзе памяншае сацыяльную талерантнасць ды звычайную прывабнасць суседства. Вось чаму праект рэнавацыі вуліцы прадугледжвае вялікія матэрыяльныя субсідыі для сучасных бедных уладальнікаў. Але і заможнаму прыватнаму сектару Рыгі будзе таксама дадзена магчымасць прыняць удзел у рэнавацыі вуліцы.

Зусім нядаўна ў Інтэрнэце было размешчана паведамленне пра планы рыжскай адміністрацыі наконт рамонту драўлянага дома на вул. Красатаю, на што плануецца выдаткаваць 805 тыс. еўра. Плануецца, што работы скончацца да 2011 г. Дом, што належыць гарадскому самакіраванню, быў пабудаваны ў 1896 г. і нядаўна перажыў пажар. У раёне забудовы месцяцца ў асноўным драўляныя дамы, што былі прызначаны для пражывання рабочых і ніколі раней не лічыліся помнікамі. Сітуацыя змянілася ў 2001 г. пасля правядзення адпаведнай канферэнцыі, пра якую гаворка ішла вышэй. Дзякуючы такому рашэнню гарадскія ўлады атрымоўваюць ад Еўразвязу фінансаванне на ўтрыманне ды ўзнаўленне запусцелых аб'ектаў. Вось і ў дадзеным выпадку 80% (644 тыс. еўра) ад усёй сумы вылучае Нарвегія праз структурныя фонды Еўразвязу, а доля Рыжскай думы складае толькі 20% (161 тыс. еўра)[2].

Методыка захавання аб'ектаў на іх першапачатковым месцы з'яўляецца асноўнай па распаўсюджанасці і самай эфектыўнай. Менавіта яна прыносіць найбольш карысці як будынкам, так і іх жыхарам, а таксама ўсім гараджанам.

**Захаванне шляхам пераносу аб'екта на новае месца.**

Як правіла, такі варыянт вырывае аб'ект з натуральнага асяродка. Ён выкарыстоўваецца пры стварэнні музеяў народнай

архітэктуры, г.зв. скансэнаў (музеяў старажытнага народнага побыту, першы з якіх, менавіта той самы “Скансэн” быў створаны А. Хазэліусам яшчэ ў 1891 г.).

Беларускі вопыт пераносу драўляных пабудоў не такі вялікі. Ён уключае толькі стварэнне Музею старажытнабеларускай культуры ў Строчыцах ды асобныя пераносы драўляных хат у Заслаўе, млына ў Дудутках. Замежны вопыт значна больш шырокі і можа быць скарыстаны гарадзенцамі.

Так, у параўнальна невялікіх краінах Нарвегіі ды Фінляндыі ўжо да 1970-х гг. існавалі каля 300 музейных установ падобнага тыпу. На ўсю вялізную Расію сёння існуе каля 20 музеяў народнай архітэктуры (гэта ў 20 разоў больш, чым у Беларусі). Першы савецкі музей народнай архітэктуры ў былым падмаскоўным сяле Каломенскае пачаў фарміравацца ў 1927 г., калі архітэктар-рэстаўратар П.Д. Бараноўскі перавёз туды гэтак званую медаварню.

За гады, што прайшлі з тае пары кардынальна быў зменены прынцып складання экспазіцыі гэтых музеяў: ад архітэктурнага – да архітэктурна-этнаграфічнага, гэта значыць ад монатэматычнага – да комплекснага, да дэманстрацыі народнай культуры ў цэлым, як матэрыяльнай, так і духоўнай.

Тэхналогія стварэння музея народнай архітэктуры і побыту складаецца з некалькіх этапаў: па-першае, выпрацоўка канцэпцыі музея, вызначэнне яго місіі, мэтаў і задач дзеяння, вызначэнне неабходных людскіх ды матэрыяльных рэсурсаў, падрыхтоўка неабходных спецыялістаў; па-другое, вызначэнне месца стварэння музея, аналіз яго сітуацыйнага становішча, добраўпарадкаванне. Лепш за ўсё за аснову будучага музея браць рэальна наяўную жылую прастору, а не рабіць гэта ў адкрытым полі. Цудоўна, калі на музеефікаванай тэрыторыі сапраўды захаваліся аўтэнтычныя аб’екты народнай архітэктуры. Як паказвае сусветны вопыт інтэграцыя мясцовых жыхароў у працу музея праходзіць даволі лёгка, бо дзейнасць музея паляпшае матэрыяльнае становішча насельніцтва, дае перспектыву развіцця ўласнага дабрабыту, напаўняе гонарам за старажытныя мясцовыя традыцыі. Трэці этап – гэта насычэнне абранай прасторы неабходнымі экспанатамі ў выглядзе перанесеных пабудоў, што шукаюцца ў населеных пунктах па ўсім рэгіёне. Выбраны аб’ект драўлянай архітэктуры дасканала вывучаецца, потым з дапамогай спецыяльнай тэхналогіі разбіраецца на складовыя элементы і на новым месцы збіраецца такім жа чынам, як і да пераносу. Пры гэтым максімум сучаснага ўнёску ў драўляную матэрыяльную структуру

канструкцыі складаюць некалькі новых цвікоў ці некалькі новых (але адпаведным чынам апрацаваных) дошак наўзамен прагнілым. У астатнім жа аб’ект не губляе ніводнай аўтэнтычнай рысы. Працэс насычэння музея архітэктурнымі экспанатамі адбываецца згодна з распрацаванай канцэпцыяй і можа працягвацца амаль бясконца.

Сёння падобны музейны цэнтр павінен мець складаную структуру, уключаць у сябе розныя зоны. Эканомія часу патрабуе кампактнага сумяшчэння ды гнуткай прасторавай узаемасувязі аб’ектаў, што раней ніколі не сумяшчаліся. Так, музейны комплекс здолее прадстаўляць сабой не толькі шэраг асобна стаячых будынкаў, маючых унутраныя функцыі, але з’яўляцца складанай сістэмай супадпарадкаваных выстаў, экспазіцый. У пэўным сэнсе, гэта музей як знутры, так і звонку. З’яўленне турыстаў зробіць рэнтабельным размяшчэнне ў дадзеным месцы аб’ектаў гандлю, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, інфармацыйных цэнтраў. Тут жа павінны знаходзіцца стаянкі для транспарта. Такі цэнтр павінен уяўляць сабой не толькі стацыянарную прасторавую структуру, якую насельніцтва наведвае эпізадычна, але шматфункцыянальны культурна-рэкрэацыйны цэнтр грамадскага прызначэння. У аснову арганізацыі ды функцыянавання музейнага цэнтру павінны быць пакладзены вольныя зносіны паміж людзьмі. Патрэбна даць магчымасць наведвальніку праводзіць час максімальна зручна.

**Захаванне інфармацыі пра аб’ект.**

Апошняя методыка прыдатная тады, калі вартасць аб’екта невысокая і магчымасць для захавання ці пераносу адсутнічае. Увогуле інфармацыя пра аб’ект вельмі важная ў кожным выпадку проста таму, што яна ўносіць удакладненні ў нашыя агульныя веды пра драўляную забудову. Драўляныя дамы вельмі лёгка могуць быць знішчаны з-за пажара ці кепскай эксплуатацыі. Але пакінутая інфармацыя дазваляе ўзнавіць абрысы будынку ці паўтарыць некаторыя яго элементы. Дэталёвае даследаванне (фотафіксацыя, дэталёвы абмер, захаванне ўзораў матэрыялу, высвятленне будаўнічай тэхналогіі і наяўнасці асобных будаўнічых элементаў) вельмі важнае для інфармацыйнага захавання аб’екту. Часткі знесеных дамоў могуць захоўвацца ў экспазіцыі, напрыклад, музеяў народнай архітэктуры.

**Па якім жа шляху павінен пайсці гарадзенскі “Новы свет”?**

Горадня мае ўсе падставы для ажыццяўлення свайго, непадобнага да іншых арыгінальнага сінтэтычнага праекту, які здолеў

бы вывесці горад на сур'ёзны еўрапейскі ўзровень па стаўленню да драўлянай спадчыны. Акрамя таго праз вырашэнне праблемы "Новага свету" могуць быць вырашаны і некаторыя іншыя гарадскія праблемы сацыяльнага, эканамічнага і экалагічнага характару.

Сінтэтычны шлях заключаецца ў сумяшчэнні праектаў па рэвіталізацыі, кансервацыі і інтэрпрэтацыі гэтага раёну.

**Рэвіталізацыя** павінна ўключаць забеспячэнне ўсіх жылых дамоў раёна неабходнымі гарадскімі выгодамі; стварэнне нармальнай інфраструктуры, а менавіта здача асобных дамоў у арэнду пад крамы, прадпрыемствы харчавання ды абслугоўвання, культурныя ўстановы; стварэнне некалькіх зонаў адпачынку – спецыяльнае дэкаратыўнае пакрыццё ходнікаў, дэкаратыўныя лавы, трохузроўневае азеляненне (дрэвы, хмызняк, газоны), месцы для гульняў малых дзяцей, абмежаванне ўезду прыватнага аўтатранспарту. Важна захаваць вялікі адсотак жылога фонду ў раёне. Для ажыццяўлення праекту рэвіталізацыі распрацоўваецца спецыяльны інвестыцыйны план, робяцца падатковыя зніжкі, прыярытэтнае права на гаспадарчую ініцыятыву аддаецца мясцовым жыхарам.

**Кансервацыя** прадугледжвае ўключэнне тэрыторыі раёну ў ахоўную зону гістарычнага цэнтра; дэтальнае вывучэнне, фіксацыя кожнага архітэктурнага аб'екту; вытлумачэнне ўладальнікам дамоў правілаў ахоўнай эксплуатацыі ды далейшы нагляд за выкананнем даведзенага; рамонт фасадаў з ліквідацыяй недарэчных або варожых гістарычнаму асяроддзю элементаў. Усе пералічаныя мерапрыемствы ажыццяўляюцца часткова за кошт уладальнікаў дамоў, часткова за кошт дзяржаўнай субсідыі.

**Інтэрпрэтацыя** – гэта размяшчэнне ў раёне малых архітэктурных элементаў у стылі гістарызму, тлумачальных стэндаў, інфармацыйных таблічак на фасадах дамоў ці побач з імі, распрацоўка экскурсійных маршрутаў па раёну, правядзенне культурных мерапрыемстваў (для гэтага можна стварыць на тэрыторыі асобны культурна-асветны цэнтр "Новы свет", які будзе праводзіць працу ў інтэрпрэтацыйным напрамку, адначасова з'яўляючыся месцам баўлення вольнага часу для дзяцей і моладзі). Дзеля гэтага дастаткова выдзяленне аднаго будынка (ці аднаго паверху) непасрэдна ў "Новым свеце" з невялікім штатам гісторыкаў і педагогаў (напрыклад, 4 чалавекі).

Нарэшце, элементы музеефікацыі. Шчыра кажучы, мы не ўпэўнены ў мэтазгоднасці ператвараць увесь "Новы свет" у адзін вялікі музей пад адкрытым небам, у гарадзенскі "Скансэн" ці "Строчыцы". Занадта ўтапічным падаецца такі праект, хаця калі

б гарадская адміністрацыя знайшла сродкі на яго ажыццяўленне, пярэчэнняў бы гэта не выклікала. Тым не менш, драўляную гарадскую прастору ў пэўных межах гэтага раёну было б мэтазгодна ўзбагачаць шляхам перанясення на вольныя месцы (якіх там цяпер шмат) або ўзамен неаўтэнтычных пабудоў драўляных дамоў з іншых раёнаў горада.

Сапраўды, праблему "Новага свету" неабходна трактаваць больш шырока ў тым сэнсе, што гэта не адзінае месца нашага гораду, дзе можна пабачыць добрую гарадскую драўляную архітэктуру. Цудоўныя двухпавярховыя маляўнічыя дамы знаходзяцца таксама на вул. Савецкіх пагранічнікаў (там іх пачынаюць ужо бурыць), вул. Дзяржынскага, на "Завяршчызне" і г.д. Цалкам відавочна, што даволі хутка горадабудаўнічыя планы нашых кіраўнікоў пачнуць закранаць і іх. Не спрабуючы бегчы наперадзе паравоза, адзначым, што па меры неабходнасці найбольш выбітныя з тых будынкаў можна было б пераносіць у "Новы свет" з захаваннем іх функцыянальнасці. Тым самым вырашаліся б адразу некалькі задачаў: вызвалялася б месца ў "каменным" цэнтры горада (на сённяшні дзень такой праблемы яшчэ няма, але яна з'явіцца на працягу наступных 10 гадоў), захоўваліся б лепшыя прыклады гарадской драўлянай архітэктуры, павялічвалася б кампазіцыйная, стылістычная ды гістарычная (музейная) вартасць "Новага свету". Практыка музейнага пераносу сведчыць, што ў адрозненне ад цагляных драўляныя дамы пераносіць можна (не па бярвенцу, але па асобных канструкцыйных элементах), максімальна захоўваючы аўтэнтычную структуру. Аднachасова рэалізуецца рамонтная, узмацняльная, кансервацыйная і рэстаўрацыйная функцыі. Кожную вёску захоўваць у трывалым гістарычным стане проста немагчыма (ды і непатрэбна), але буйны горад можа дазволіць сабе такую раскошу.

Пры рэалізацыі комплекснага праекту, складзенага хаця б часткова на аснове дадзеных прапаноў, наш горад атрымаў бы новы драўляны цэнтр з маляўнічымі жылымі дамамі (калі хочаце, элітнымі), прадпрымальніцкай ды культурнай актыўнасцю, непаўторнай гістарычнай атмасферай, аналагу якой пакуль няма ў Беларусі. Акрамя таго, ва ўмовах штогадовага павялічэння аўтамабільнага трафіку ў горадзе раён заставаўся б (разам з паркам ім. Жылібера) "лёгкімі" горада. Ужо не кажучы пра псіхалагічныя ды сацыяльныя выгоды жыхарам, якія б захавалі ўласныя дамы.

На сённяшні дзень можна канстатаваць, што ў Горадні гарадская драўляная забудова захавалася добра, прычым не ў якасці

музея, але як жывы арганізм. Драўляны дом – гэта экалагічнае жытло з натуральным кліматычным кантролем, як правіла, у атачэнні зеляніны. Шмат дзе ў “Новым свеце” захаваўся сядзібны тып гаспадаркі.

У такіх асяродках працягваюць існаваць некаторыя элементы гарадской архітэктуры, што на некаторы час выйшлі з арсеналу архітэктараў. Цяпер гэтыя гарадскія драўляныя раёны маглі б быць крыніцай ідэяў для маладых спецыялістаў. Гаворка тут ідзе галоўным чынам пра планіроўку раёнаў і асобных будынкаў, ідэю суразмернасці іх чалавеку, шчыльнасць забудовы. У старых драўляных гарадах адчуванне раўнамернай забудовы ўзмацняецца не толькі дзякуючы самім дамам, але таксама зеляніне і выкарыстанню агароджаў, гаспадарчых прыбудоў. Галоўным чыннікам тут з’яўляюцца асаблівасці самае драўніны, як будаўнічага матэрыялу, што стварае суразмернасць пабудовы чалавеку. І менавіта ў гэтым адна з найбольш сталых прыкмет традыцыйнасці забудовы, бо калі канцэпцыя горада і архітэктурныя стылі ўвесь час мяняліся, памер самога чалавека заставаўся ранейшым, таксама як і чалавечыя патрэбы ды адчуванні.

У драўлянай спадчыне значэнне мае любая будаўнічая дэталь, што стварае аб’ект (спосаб стыку бярвення, канструкцыя перакрыццяў і даху; ва ўсім гэтым крыюцца прыкметы традыцыйнага нацыянальнага цяслярства). Фактычна, драўляныя дамы ў нашым горадзе – гэта тая беларуская архітэктурная спадчына, якой у горадзе пры дасканалым аналізе нашай забудовы не так ужо і шмат. Ліквідаваную драўляную спадчыну немагчыма аднавіць.

Вельмі важна змяніць адносіны грамадства да драўлянай спадчыны, дапамагчы зразумець яе каштоўнасць ды новыя магчымасці выкарыстання. Драўляная архітэктура застанецца толькі тады, калі яна будзе прынята грамадствам і асабліва моладдзю.

---

1 Шургин И. О деревянном архитектурном наследии в России. http://magazines.russ.ru/vestnik/2004/11/sh37-pr.html

2 Реставрация деревянного дома в Риге обойдется в 800 тысяч евро. http://realty.lenta.ru/news/2008/06/13/riga/

# "Новы свет" ва ўспамінах ягоных жыхароў

## Грандзіцкая вуліца і Дроўны рынак[1]

**Здзіслаў Цыпельт (Горадня-Варшава)[2]**

Калі глядзім на план Горадні 1937 г., то без цяжкасці знойдзем яго паўночны раён, які знаходзіцца паміж вуліцамі Базыліянскай, Нарутовіча, Рэйманта і Снядэцкага. У тыя часы гэта быў новы раён пераважна з нізкай драўлянай забудовай. Месціўся ён сярод агародаў і садоў, якія стваралі досыць вялікі, раскінуты, зялёны прастор. Толькі дзе нідзе вырастала мураваная будоўля, але і яна гублялася сярод высокіх дрэваў. Самай доўгай вуліцай у тым раёне была Грандзіцкая. Цягнулася яна ад плошчы Тызенгаўза, якую называлі таксама пляцам Волі, на поўнач у кірунку вёскі Грандзічы, што знаходзіліся ў 5 км ад гораду. Вуліца Грандзіцкая завяршалася каля вул. Каліноўскага, і адначасова была пачаткам Грандзіцкай шашы. Вуліца ад шашы адрознівалася пакрыццём. Вуліца Грандзіцкая была брукаванай, а шаша была пасыпаная жвірам.

Менавіта на стыку Грандзіцкай вуліцы і шашы фарсухі з Грандзічаў і іншых бліжэйшых вёсак затрымліваліся, каб атрэсці пыл з ног і апрануць чаравікі. У тыя часы было прынята хадзіць босымі па вёсцы, ці па прадмесцю. Невядомыя зараз малочніцы часта хадзілі без абутку, носячы за плячыма і перад сабой конаўкі з малаком і літровыя меркі. У абутку ішлі ў касцёл, да мясцовых уладаў ці "ў госці". Безумоўна, што заможныя хадзілі ў абутку, як правіла, калі ездзілі на фуры ці фурманцы за пакупкамі.

Раён, аб якім пішу, знаходзіўся ў найвышэйшай частцы горада. Стоячы на выхадзе з вул. Каліноўскага на вул. Грандзіцкую, дзе калісьці была прадуктовая крама Вашкевіча[3], можна было ўбачыць зялёную панараму горада. Бліжэйшая частка горада ў раёне яру Гараднічанкі размяшчалася ніжэй. На даляглядзе былі заўважнымі белыя барочныя вежы гродзенскай Фары, досыць каранасты (камлюкаваты) і моцна асеўшы будынак Гарнізоннага касцёла і высокі



**Дроўны рынак. Здымак 1936-1939 гг. Зроблены з сучаснай вул. Горкага. Цяпер злева на месцы драўляных дамкоў дзевяціпавярховы будынак, справа – пачатак вул. Базыліянскай (зараз Лермантава) з домам №8.**

спічасты сілуэт бернардынаў. Брыгіткі хаваліся сярод дрэваў, якія раслі ў кожным раёне горада. Сярод дрэваў і іншых будынкаў былі заўважны абрысы Замкаў – Новага і Старога. Асабліва прыгожай выглядала панарама Горадні, калі заходзячае сонца асвятляла белыя вежы касцёлаў і замкаў. Жывая, сакавітая зеляніна дрэваў хавала часта ўбогія дамкі і дрэнна пахнучыя канавы.

Вуліца Грандзіцкая і Дроўны рынак – гэта месцы, якія ўзгадваю праз шмат гадоў. Іх вобраз так добра захаваўся ў маёй памяці, што нават сучасныя вобразы не перакрэслілі яго. Увесь час бачу даўнюю вул. Грандзіцкую і прылягаючы да яе рынак.

Тая вуліца пачыналася з плошчы Свабоды (пляцу Волі), дакладней з масіўнага маста над Гараднічанкай, які вёў да палаца архірэя[4]. Гэты палац стаяў у глыбіні старога парку. Ён моцна нас уражваў. Унутры палац быў досыць цёмны, цемру ўзмацнялі высокія густыя дрэвы і засланяючыя вокны кусты. На ўнутраных сценах палаца былі намаляваны постаці святых. Гэта быў жывапіс выкананы ў візантыйскім стылі. Аскетычныя постаці на выявах вялікімі сумнымі вачыма пранізліва глядзелі на нас. Дадатковае ўражанне ствараў пах кадзідлаў, моцны і пранізлівы, які значна адрозніваўся ад кадзідлаў касцёльных. У гэтай стэнаграфіі перасоўваліся бясшумныя, цалкам апранутыя ў чорнае, у прылеглых да галавы чапцах “манашкі”. Калі быў яшчэ малым, чакалі мы побач з палацам бацюшку, каб у адпа-

ведны момант схапіцца за гузік. Аднойчы, убачыўшы бацюшку, які набліжаўся да нас, схапіліся за гузік, а бацюшка павярнуўся і кажа: “Лепш бы вы хапаліся за галаву, каб захаваць рэшткі розуму, якога не хапае”. З гэтага моманту я больш не хапаўся за гузік.

Вуліца Грандзіцкая да габрэйскіх могілак з абодвух бакоў была засаджана таполямі і ліпамі. На некаторых участках ствараліся падвойныя шэрагі. Калі ісці вуліцай угору, то з левага боку паказываўся шырокі агарод і сад, а з правага – зарослыя дрэвамі будынкі вайсковай жандармерыі, а затым шпіталя. Сярод дрэваў стаялі масіўныя аднапавярховыя будынкі з цэглы, у якіх таксама жылі сем’і вайскоўцаў[5]. Гэтая тэрыторыя быў аточана агароджай на падмурку і жывой загараддзю.

За вайсковымі забудовамі, да якіх прылягалі жылыя дамы з прадуктовай крамай, перпендыкулярна Грандзіцкай ішла вуліца Міцкевіча. Яна таксама была ўся густа засаджаная дрэвамі з агародамі і садамі ў яе глыбіні. Стаялі там мураваныя і драўляныя дамы, сярод якіх вылучаліся дом і крама з першакласнымі каўбаснымі вырабамі пана Полудня.

З левага боку вул. Грандзіцкай брала свой пачатак вуліца Базыліянская, якая вяла ў бок Нёмана. На гэтай вуліцы быў збуда-



**Былая мясная лаўка Полудня на скрыжаванні вул. Бялінскага і Міцкевіча**

ваны досыць вялікі будынак КОП[6]. Там, насупраць “Завершчызны” знаходзілася школа № 8, многія настаўнікі якой загінулі падчас акупацыі, а яшчэ далей – цагляны завод Аркіна[7], за якім была ўжо Каложа з XII ст., якая стаяла на высокім беразе Нёмана.

У пачатку 1930-х, калі матар'яльнае становішча маіх продкаў збольшага стабілізавалася, яны вырашылі зноў набываць зямлю з маёнтку Станіслававова. Надта ж дзеду хацелася збудаваць двухпавярховую камяніцу і мець прыгожы сад. І вось 10 сакавіка 1932 году ён купляе 10 акраў (1000 кв.м.) за 4000 злотых. Праз год, 2 сакавіка 1933 году жонка дзеда Юзафа Гуменюка Галіна купіла яшчэ 10 акраў зямлі, праўда, ужо за 4500 злотых. Такім чынам атрымалася, што хата, дзе жылі Сарокі і Гуменюкі, стаяла па адзін бок вуліцы Панятоўскага, а агарод знаходзіўся па другі бок. А гэта значна ўскладняла паліўку. Рэч у тым, што вадаправоду на гарадзкой ускраіне тады яшчэ не было (яго праклалі ў пэрыяд нямецкай акупацыі), а ваду бралі (зразумела, не бясплатна) з калодзежа суседа – пана Калоўскага. Тым ня менш, як вынікае зь дзённікавых запісаў Івана Людвікавіча Сарокі, 30 кастрычніка і 6 лістапада 1933 году на купленай зямлі было пасаджана 53 дрэвы. Зь іх 22 яблыні, 11 груш, 19 сьліваў і адна вішня. У наступныя гады колькасьць вішняў павялічвалася. Пасадзілі таксама шмат кустоў агрэсту і парэчкі трох гатункаў (белая, чырвоная і чорная). Для ўласнага ўжытку вырошчвалі бульбу, моркву, фасолю, агуркі, капусту ды іншую драбязу. Трымалі таксама дзьвюх сьвінак і звыш 40 курэй пароды „Сусэкс". Нейкі час нават качак трымалі. Малако куплялі ў малочніцы. Такім чынам сям'я з шасьці чалавек поўнасьцю сябе забясьпечвала харчаваньнем. А рэальныя грошы w Urzędzie Ziemskim зарабляў толькі мой дзед – Юзаф Гумянюк.

## Правінцыйнае шчасьце

Даволі хутка ўтрыманьне саду аплацілася. Бо ўсе дрэвы былі сартавыя, прывезеныя аднекуль здалёк, і ўраджай на новай зямлі давалі фантастычны. Для ўласнага ўжытку ня так і шмат патрабавалася тых фруктаў. Мая прабабка і бабка выраблялі цудоўнае віно з парэчак! Большасьць тых фруктаў скуплялі оптам гандлярыжыды – уладальнікі прыватных спажывецкіх крамаў. Прычым самім ня трэба было і пальцам варушыць – жыды наймалі паробкаў для

збору ўраджаю. Тыя фрукты пасьля йшлі на перапрацоўку – зь іх выходзілі файныя джэмы, сочывы ды іншыя кансэрванты. Зрэшты, жыды загадзя дамаўляліся з гаспадарамі і плацілі залічку, калі бачылі, што будзе добры ўраджай фруктаў.

Як пазьней распавядаў мой дзед, да жыда можна было хоць ноччу прыйсьці і выцягнуць яго з ложку, але ён заўсёды, каб ня страціць кліента, прадасьць што трэба. А калі няма грошай, дык запіша „на чорную кніжку" і адпусьціць тавар. З той „чорнай кніжкай" у майго дзядзькі Канстанціна Драздоўскага атрымалася прыкрая гісторыя. Будучы ў 1930-я гімназістам, ён ня мог абыякава прайсьці міма крамы жыда Касмандэля, каб не набраць там цукерак ды іншых ласункаў. Зразумела, усё запісвалася „на чорную кніжку". Неяк пры нагодзе Касмандэль сустрэў бацьку ўвішнага гімназіста – Канстанціна Іванавіча і кажа:

– *Panie Drozdowski, a czy pan wie, że pański synek korzysta z moich usług? Pokażę panu rachuneczki…*

Ну, а калі малады Кастусь вярнуўся з гімназіі, дык бацька ўжо чакаў яго ў хаце з рамянём ў руках. І са словамі *„Ja ci, skurwielu, pokażę, jak u żyda brać bez pieniędzy!"* так выхластаў дзягай небараку, што той і дарогу забыў да той крамы!

Зрэшты, і сам Канстанцін Іванавіч Драздоўскі (1898-1981) у 30-60-я гады мінулага стагодзьдзя праславіўся ў Гродне, як адна з самых экстраардынарных постацяў. Родныя распавядалі, што ён, застаўшыся рана сіратою, выхоўваўся ў манастыры ў Супрасьлі, дзе здабыў першапачатковую адукацыю і разьвіў талент сьпевака. Пасьля вывучыўся на бухгальтара. Сучасьнікаў зьдзіўляла, як ён таленавіта спалучаў рэлігійныя сьпевы, бухгальтарскую дакладнасьць зь цягай да выпіўкі, кабет і азарту. І свой зямельны ўчастак на ўсё той жа вуліцы Панятоўскага ён не набыў, а выйграў у карты ў нейкага польскага капітана! Як вынікае з дзёньнікавага запісу Івана Людвікавіча Сарокі, "*Дроздовский поставил дом в 1933 году и 17 сентября перешел туда жить*»[1].

Па ўсім відаць, Канстанцін Іванавіч Драздоўскі быў ня толькі hazardzistą і валодаў адметным голасам (бас) у царкоўным хоры, але й меў *inne męskie zalety*. Нездарма ж ягоная жонка Марыя Мартынаўна (дзявочае прозьвішча Станкевіч) хадзіла біць вокны кабетам, якія запрашалі яго ў госьці „пасьпяваць". Пасьля вайны, пры „Другіх Саветах" Драздоўскі працаваў нейкі час галоўным бухгалтарам гарадзенскага пэдінстытуту (цяпер унівэрсытэт імя

[1] Сёння дом №13 па вул. Астроўскага



**Вул. 17 верасня, д. 12**

Я.Купалы) і адначасова быў рэгентам царкоўнага хору Пакроўскага сабору, што па тых „атэістычных часах” было экстраардынарным выпадкам. Сумяшчаючы гэтыя дзьве працы, Канстанцін Іванавіч ня стрымліваў свайго поцягу да азарту – гуляў у паблізкім Доме афіцэраў ці гарадзкім парку на грошы ў більярд! Толькі такім чынам ён адчуваў паўнату жыцьця і быў па-свойму шчасьлівы. Гэтаксама, як мае дзед з бабуляю бачылі шчасьце ў вырошчваньні кветак і дрэваў...

## Крыўдлівая малпачка

Згадваючы гарадзенскае жыцьцё міжваеннага перыяду, немагчыма абыйсьці яскравую і адначасна трагічную постаць заснавальніка мясцовага заапарку Яна Каханоўскага. Ён быў аднагодкам майго дзеда (нарадзіўся ў 1894 годзе) і працаваў у 1920-30-я гады выкладчыкам прыродазнаўства ў гарадзенскай гімназіі імя Адама Міцкевіча. Яшчэ ў 1926 годзе Каханоўскі пасьля карпатлівай падрыхтоўкі заклаў непадалёк гімназіі на частцы сучаснага гарадзкога парку імя Жылібэра Батанічны сад, які займаў плошчу 0,3 га і пад канец 1920-х у ім налічвалася 830 розных відаў раслін, дрэў і кустоў.

Адначасна Ян Каханоўскі заснаваў у гімназіі прыродазнаўчы музей і заалягічны аддзел батанічнага саду. Пасьля ў яго зьявілася ідэя стварэньня ў Гродне сапраўднага заапарку. Аднак для разьмяшчэньня жывёлаў патрабавалася спэцыяльная тэрыторыя. Ідэю Яна Каханоўскага падтрымалі ў мясцовым Таварыстве аматараў прыроды. Пасьля абіваньня парогаў розных уладных ўстановаў і магістрату Таварыства дамаглося, каб Гарадская Рада сваёй пастановай ад 2 верасьня 1929 году перадала пад заапарк велатрэк па вуліцы Станіслаўскага (цяпер Ціміразева). Больш за тое, на просьбу Яна Каханоўскага, Рада выдаткавала 250 злотых на рамонт агароджы будучага заапарка і 350 злотых на перанясеньне зьвяроў і птушак на новае месца. У 1936 годзе гарадзенскі заапарк налічваў каля 400 экспанатаў, сярод якіх былі такія экзатычныя для Крэсаў драпежнікі як тыгр, леў і леапард.

– Неяк, ці то ў 1937-м ці то ў 1938-м маці мяне павяла ў заапарк, – успамінае мой бацька Ігар Гумянюк. – З правага боку ад галоўнага ўваходу знаходзіліся клеткі з малпамі. Дык вось адна малпачка, якую звалі Коко, гуляла свабодна па-за клеткамі, бо была хворая. Зазвычай дзеці яе клікалі “Koko, chodź na magistracką zupę!” і давалі розныя прысмакі. Паколькі ў мяне ў руках была вялізная маркоўка, дык Коко кінулася да мяне. А калі я не зажадаў дзяліцца з малпай апэтытным ласункам і схаваў маркоўку за сьпіну, яна ўчапілася ў мае буйныя кучаравыя валасы і пачала верашчаць. Я, натуральна, страшэнна перапужаўся і заплакаў. Уратаваў мяне нехта з даглядчыкаў заапарку…

У 1930-я Ян Каханоўскі жыў на вуліцы 11 лістапада (цяпер, па іроніі лёсу, вуліца 17 верасьня), зусім непадалёк ад вуліцы Юзафа Панятоўскага, дзе знаходзілася хата маіх продкаў. Фактычна, у невялічкім Гродне, у якім на 1931 год пражывала 49 932 жыхары, і Батанічны сад, і гімназія імя Адама Міцкевіча, і новаўтвораны заапарк знаходзіліся непадалёк.

Паколькі заапарк разьвіваўся, дык патрабаваліся тэрыторыі для пашырэньня. Таварыству аматараў прыроды не па кішэні было купляць зямлю з маёнтку Станіславова, ўладальнік якога князь Ян Марыя Друцкі-Любэцкі запрасіў за неабходныя для заапарка 0,4 га ажно 13000 злотых. Нават Рада магістрата вагалася: ці варта выдаткоўваць такую суму грошай. Аднак 23 верасьня 1937 году Рада адзінагалосна дала згоду на набыцьцё тых земляў для заапарка.

У гады фашыстоўскай акупацыі заапарк быў разбураны. Лепшыя экзэмпляры жывёлаў немцы вывезлі ў Кёнінгсбэрг, а заснавальніка заапарку Яна Каханоўскага расстралялі ў 1942 годзе…

## Савецкі маскарад

Да канца 1939 году саветы нацыяналізавалі ў Гродне 23 прадпрыемствы. Сярод іх шклозавод, фанерную фабрыку, велазавод, тры лесапільні. Напрыканцы 1940-га ў Гродне ўжо дзейнічалі 33 прадпрыемствы, у тым ліку дзьве тытунёвыя фабрыкі, фанерны завод, хлеба- і мясакамбінаты, два гарбарныя заводы, абутковая фабрыка, піўзавод, на якіх агулам працавала каля 3 500 рабочых. Фактычна, заслуга саветаў тут невялікая, бо большасьць з тых прадпрыемстваў дзейнічала і за польскім часам, хіба што цяпер яны сталі дзяржаўнымі.

Уласьцівая для бальшавіцкай улады гігантаманія, паказуха, некампэтэнтнасьць і неадукаванасьць былі навідавоку. Саветаў шакіраваў узровень жыцьця гарадзенцаў.

Натуральна, што савецкія начальнікі імкнуліся пасяліцца ў асабняках «польскіх паноў». Даспадобы партыйным бонзам прыйшлася будыніна па Астроўскага № 11 - Год пабудовы 1936. Дом інжынерагеадэзіста Высоцкага. Пасля 1939 г. – канфіскаваны на карысьць партыйнага кіраўніцтва горада. Пасьля Другой сусветнай вайны ажно да канца 1980-х у ёй жылі высокапастаўленыя партыйныя начальнікі, сярод якіх і найбольш вядомы сакратар гарадзенскага абкама КПБ Леанід Кляцкоў. Пасьля будынак перадалі музычнай школе. А зараз там разьмясціўся Гарадскі цэнтр сацыяльнапсіхалягічнай дапамогі.

## Бальшавіцкая „дабразычлівасьць"

Некаторыя пракамуністычныя гісторыкі тлумачаць рэпрэсіі НКВД на Крэсах супраць ні ў чым невінаватых людзей нібыта шырокім „рухам польскага супраціўленьня", які разгарнуўся ў 1940-1941 гг. Насамрэч, і гэта зараз прызнаецца навукоўцамі ў сучаснай Расеі, праводзілася планамерная палітыка генацыду. Прычым вывозілі ня толькі палякаў. Вось, напрыклад, сусед маіх продкаў з вуліцы Юзафа Панятоўскага доктар Беклемішаў быў чыстакроўным расейцам[2]. І ягоная састарэлая служанка па прозьвішчы Малова таксама была расейкай. І жылі яны ў Гродне яшчэ з царскіх часоў. У несыстэматызаваным дзёньніку майго прадзеда Івана Людвікавіча

---

2 Дом доктара Беклемішава зараз знаходзіцца на вул. Астроўскага, у ім размяшчаецца эндакрыналагічны дыспансэр. Гэты будынак – адзін з самых цікавых прыкладаў архітэктуры канструктывізма ў нашым горадзе.

Сарокі ёсьць кароткі запіс: “*увезли Б.К.Л. (г.зн. Беклемішавых. – аўт.) Старушка Малова падаравала маёй бабулі Галіне на разьвітаньне ікону Божай Маці ў срэбным акладзе*”.

Беклемішавых саслалі ў Казахстан і, як пасьля ўдалося даведацца, доктар і там знайшоў прымяненьне саім ведам – згодна клятве Гіпакрата дапамагаў хворым. А пасьля вайны нават стаў прафесарам. Найбольш масавыя дэпартацыі жыхароў Крэсаў бальшавікі праводзілі ў лютым, красавіку, чэрвені 1940-га, а таксама напярэдадні вайны – у чэрвені 1941-га. Агулам за пэрыяд з кастрычніка 1939 г. да 20 чэрвеня 1941 г. з Крэсаў было дэпартавана больш за 120 тысяч чалавек. На 1939-1941 г. (?) начальнікам НКВД у Гродне быў расеец Міхаіл Адзінцоў.

## Права на жыццё і працу

Як я ўжо пісаў, пасьля верасьня 1939 году ў Гродне панавала атмасфэра панічнага страху перад бальшавіцкімі рэпрэсіямі. Людзі давалі веры ўсялякім прымхам і забабонам. Маўляў, вывозяць толькі тых, у каго ў дакумэнтах ёсьць лічба 3 (у гонар сумнавядомых сталінскіх судоў-троек). Той, хто знаходзіў гэтую лічбу, маліўся ўдзень і ўначы, каб толькі не надарылася бяда. Магчыма, маіх продкаў і выратавала тое, што прабабка Алена Сарока ўзяла да сябе на кватэру трох афіцэраў-танкістаў, якія пакінулі з пачаткам вайны свае рэчы, у тым ліку патэфон з наборам кружэлак. Акрамя запісаў папулярных у той час мэлёдый кшталту „Рыё-Рыта”, у тых танкістаў былі таксама і кружэлкі з прамовамі Сталіна. Калі ў чэрвені 1941-га прыйшлі новыя „гаспадары жыцьця” – немцы, мой дзед Юзаф Гумянюк у жаху парубаў сякерай гэтыя кружэлкі за прыбіральняй на дробныя кавалкі…

Пакуль жа савецкая ўлада заангажавала Юзафа Гумянюка, як інжынера-геадэзіста (сваіх спэцыялістаў, якія б так дасканала ведалі рэгіён, у саветаў не было) у райсяльгасуправу, цэнтральная кантора якой знаходзілася ў Беластоку. Вось і даводзілася дзеду часта шыбаваць у Беласток і назад. Каб мець дадатковую карысьць, ён прывозіў у Гродна схаваны ў жаночых панчохах страшэнна дыфіцытны на той час цукар. Нават 72-гадовы Іван Людвікавіч Сарока ня быў пры першых саветах беспрацоўным, як за польскім часам. Як вынікае з ягонай легітымацыі „Прафесіянальнага саюзу рабочых лесу і сплаву цэнтральных і паўднёвых раёнаў” з верасьня 1940-га па чэрвень 1941-га, ён працаваў кур’ерам Гарадзенскай Сплаўканторы.



**Дом на завулку Рэйманта, зруйнаваны летам 2008 г**

Такім чынам цалкам верагодна, што праблема беспрацоўя пры саветах неяк выращалася. Выращалася і праблема з адукацыяй. Загадваў гарадзкім аддзелам народнай адукацыі жыд Нохім Гіршавіч Шапіра. Адукацыі надавалася на Крэсах асаблівая роля. І ня толькі ў барацьбе з непісьменнасьцю, а як інструмэнту ідэалягічнай апрацоўкі маладога пакаленьня. У 1940-41 гг. у Гродне дзейнічала 9 сярэдніх, 10 няпоўных сярэдніх і 2 пачатковыя школы, у якіх займалася 11 584 вучні. Гэта было значна больш, чым за польскім часам. У дадатку ў Гродне працавала 27 школ для дарослых, у якіх вучылася 1854 асобы. Колькасьць настаўнікаў у школах узрасла з 220 да 360. Каб рыхтаваць новыя кадры для сыстэмы адукацыі, у 1940-м у Гродне адкрылася першая вышэйшая навучальная ўстанова – настаўніцкі інстытут. Дзейнічалі тут да вайны 2 тэатры, 5 кінатэатраў, 3 бібліятэкі і 9 дзіцячых садкоў…

## «Ратуйся, хто можа!»

У Гродне, як і ў дзесятках іншых гарадоў тадышняй БССР, на якія 22 чэрвеня 1941 году пасыпаліся нямецкія бомбы, была неверагодная паніка, і людзі інстынктыўна дзейнічалі паводле прынцыпу самазахаваньня – «ратуйся, хто можа». Навучаныя і загартава-

ныя досьведам Першай сусветнай і Польска-бальшавіцкай войнаў, гараджане ў першую чаргу імкнуліся назапасіцца прадуктамі харчаваньня ды іншымі рэчамі першай неабходнасьці. Таму й ня дзіва, што найбольш прывабнымі для натоўпу аказаліся «багатыя» вайсковыя харчовыя склады. Кожны браў тое, што мог пацягнуць. Нярэдка ў хаатычнай барацьбе за прадукты ўзьнікалі патасоўкі. Сваякі прыгадвалі красамоўны выпадак, калі састарэлая жанчына каціла па вуліцы бочку таплёнага масла, а маладзейшаму за яе мужчыну дасталася толькі дошка ад расьціснутай натоўпам падобнай бочкі, але з парэшткамі масла. Дык той спрытнюга заляпіў гэнай дошкай з маслам кабеце ў твар, перахапіў бочку ды ўцёк…

За два-тры дні анархіі і безуладзьдзя ў Гродне, гараджане пачысьцілі ўсе дзяржаўныя харчовыя склады і крамы. Зрэшты, аб'ектам іхняга зацікаўленьня былі ня толькі масла, хлеб і кансэрвы. Бралі таксама і сухі сьпірт, а таксама сьпірт у выглядзе жэле, які выкарыстоўвалі для распальваньня прымусаў. Мой дзед Юзаф Гумянюк нават «наведаў» два пакінутыя саветамі танкі.

– Ён сьпярша праз люк у башні залез у адзін танк, а пасьля ў суседні, – успамінае мой бацька Ігар Гумянюк. – У выніку мы займелі два танкавыя гадзіньнікі з двухтыднёвым заводам. Гадзіньнікі ў танках мацаваліся на чатырох шрубах, таму іх нескладана было адкруціць. Адзін, здаецца, хутка прадалі, а другі працяглы час быў аздобай нашай кватэры. Мая маці абшыла гадзіньнік прыгожай тканінай, і ён натуральна ўпісаўся ў інтэр'ер…

Як і ў выпадку з «першымі саветамі», да немцаў таксама трэба было прыстасоўвацца, каб выжыць, каб перажыць чарговую акупацыю. Нямецкая жандармэрыя ды іншыя дапаможныя службы зьявіліся ў Гродне толькі на трэці дзень пасьля бамбардаваньня і панічных уцёкаў саветаў. Немцы прыехалі на матацыклах і высокіх конных павозках ды спыніліся «перадыхнуць» на рагу ў злучэньні былой вуліцы 11 лістапада і вуліцы Міцкевіча (якраз непадалек цяперашняй сядзібы Саюзу палякаў Беларусі). Тады там узвышаўся вялізны драўляны крыж (адразу пасьля вайны саветы гэты крыж сьпілавалі – аўт.). Прывітаць «вызваліцеляў ад бальшавізму» выйшла фраў Кляйншмітова, якая лічылася фальксдойчам і яшчэ некалькі ейных каляжанак, што жылі па суседзтву. Яны прынесьлі мядніцы з цёплаю вадою, чыстыя ручнікі, нават прапанавалі нямецкім афіцэрам напарфумавацца «фірмовым адэкалёнам», прыхаваным яшчэ з польскага часу…

## У ПАЛОНЕ НАІЎНЫХ СПАДЗЯВАНЬНЯЎ

Натуральна, як і ў выпадку з „першымі саветамі”, мясцовыя жыхары наіўна спадзяваліся, што ў горадзе запануе дэмакратычнае самакіраваньне, а колішнім гаспадарам вернецца прыватная ўласнасьць. Практычныя немцы выкарысталі анітысавецкія настроі польскай грамадзкасьці, і таму сьпярша на чале цывільнай адміністрацыі паставілі палякаў: зь ліпеня па верасень 1941 г. абавязкі гарадзкога камісара Гродна выконваў колішні польскі судзьдзя Завадзкі, пасьля – Зыгмунт Гарбачэўскі. Тое, што галоўныя адміністрацыйныя пасады займаюць адно палякі, незадавальняла беларускіх нацыяналістаў, бо і яны прэтэндавалі на тыя пасады.

Урэшце, немцы, праводзячы палітыку „падзяляй і валодай”, разагналі польскую цывільную адміністрацыю, а частку польскай інтэлігенцыі (у тым ліку і судзьдзю Завадзкага) улетку 1942 г. расстралялі. Таму надалей пасаду бургамістра Гродна на працягу ўсяго пэрыяду акупацыі займаў немец Штэйн.

Ідэалягічная прапаганда пры немцах была пастаўленая на найвышэйшую ступень. 15 кастрычніка 1941 г. Гродна перайменавалі на Гартэн. Родная вуліца маіх продкаў – Юзафа Панятоўскага – стала называцца Блюхерштрасэ, а вуліца Ажэшкі – Гітлерштрасэ. У самым пачатку акупацыі з самалётаў немцы раскідалі рознакаляровыя антысавецкія ўлёткі. Як успамінаў мой бацька, яны, малалетнія хлапчукі, лёталі па вуліцы і зьбіралі гэтыя паперкі. На адной з улётак Сталін быў пэрсаніфікаваны ў асобе двулікага Януса, з аднаго боку твару якога выяўлены хцівы жыд, а з другога – жабрак-селянін. Пад малюнкам знаходзіўся наступны тэкст:

*Хаим денежки считает,*
*А колхозник голодает.*
*Так у нас заведено*
*Батькой-Сталиным давно.*

Улётак было шмат, і зьбіралі іх збольшага не дзеля таго, каб купіцца на прапаганду, а для распалкі печак.

Некалькі месяцаў ад пачатку акупацыі за цяперашнім хлебакамбінатам у раёне вуліцы Дзяржынскага немцы стварылі лягер для савецкіх ваеннапалонных. Сярод палоных было шмат майстравітых хлопцаў, і яны за хоць якія харчы выразалі з дрэва ці фанэры розныя вырабы – лыжкі, дудачкі і самалёцікі. Таму дзеці, захопленыя гэтымі „цудамі”, усімі праўдамі і няпраўдамі вымольвалі

ў бацькоў які кавалак хлеба ці яблык для палонных. Сьпярша нямецкая ахова нават не рэагавала на частыя візыты дзяцей да палонных, а пасьля гэты лягер некуды перанесьлі.

## Праца вызваляе?

Нягледзячы на ўсе цяжкасьці ваеннага часу, нямецкім акупацыйным уладам удалося наладзіць у Гродне прамысловую вытворчасьць і гандаль, якія, вядома, працавалі на карысць Рэйху. Паводле распараджэння рэйхсміністра акупаваных тэрыторыяў Альфрэда Розэнбэрга, усё насельніцтва ва ўзросьце ад 18 да 45 гадоў павінна было несьці абазковую працоўную павіннасьць.

Вось і мой дзед Юзаф Гумянюк уладкаваўся амаль паводле спэцыяльнасьці – ва ўстанову Grunstuckgesellschaft, якая займалася геадэзічнымі распрацоўкамі, добраўпарадкаваньнем і азеляненьнем Гродна і ваколіцаў. Балазе дзед валодаў нямецкай мовай і нават гатычнай каліграфіяй, што й дапамагло ў працаўладкаваньні.

Установа *Grunstuckgesellschaft* знаходзілася ў былым асабняку вядомага ў 1910-1930-я лекара Аляксандра Тальгейма (1873-1937), які працяглы час працаваў галоўным лекарам гарадзенскага гарадзкога шпіталю. Пабудаваны Тальгеймам у 1911 годзе асабняк няблага захаваўся і дагэтуль (цяпер вуліца Леніна, 22).

У пляны ўстановы *Grunstuckgesellschaft* уваходзіла, між іншым, рэстаўрацыя Швайцарскай даліны. Праз гады дзед успамінаў, што супрацоўнікам канторы немцы ў якасьці службовай пайкі давалі выцяжку з малака – „масьлянку”. Увогуле, нават для прывілеяваных супрацоўнікаў харчовыя і прамысловыя тавары разьмяркоўваліся па картках. Нормы вызначаліся паводле катэгорыяў. Але тыя нормы былі мізэрныя. Каб ня ўласная гаспадарка, дык давялося б зусім цяжка. Хто меў запасы мукі, дык выпякаў хлеб ці булкі сам, у адсутнасьць печыва ратавала бульбяная бабка. Суп у горшым выпадку варылі зь лебяды ці крапівы. Але, нягледзячы на абмежаваньні нямецкіх акупацыйных уладаў, нават пад бокам самога унтэрштурмфюрэра СС Эрыха Шота, які пасяліўся ў колішнім доме былога суседа маіх продкаў – сасланага саветамі доктара Беклемішава – яны трымалі дзьве сьвінкі і больш за сорак курэй. У дадатку сад надалей даваў добры ўраджай, а фрукты можна было прадаваць на базары. Дый нямецкія афіцэры, падначаленыя Эрыха Шота, часценька завітвалі, каб набыць сьвежую гародніну для закусі…

Немцы страшэнна баяліся інфэкцыйных захворваньняў, таму, калі жандары прыходзілі з чарговым вобыскам, ці праводзілася

нейкая плянавая „зачыстка”, мая цётка Таіса, згодна рэкамэндацыі бацькоў, тэрмінова клалася ў ложак у якасьці „ахвяры” тыфу ці шкарлятыны. Жандары ў такім выпадку, патыркаўшы багнэтамі ў матрацы, хутка вылятали з хаты. Каб народжаную ў 1929 годзе Таісу ня вывезьлі на прымусовыя працы ў Нямеччыну, ёй падрабілі мэтрыку і на год амаладзілі.

## Дзіцячыя свавольствы

Вайна не вайна, а дзецям заўжды хочацца забаўляцца і свавольнічаць. Натуральна, захапленьнем аднагодкаў майго бацькі былі самалёты, якія ў якасьці аэрадрому выкарыстоўвалі поле за агародам майго дзеда і домам інжынэра-чыгуначніка Астроўскага. Гэта былі самалёты дапаможнай авіяцыі, так званыя лёгкія jednopłatowce, ці, як іх называлі ў народзе – bociany. Лётнікі жылі на вуліцы Рэйманта і, нават, калі былі ў добрым гуморы, дазвалялі дзецям дакранацца ці ўлазіць на свае машыны.

Натуральна, што ў адсутнасьць жонак, нямецкія афіцэры і жаўнеры карысталіся паслугамі прастытутак. ССман Эрых Шот трымаў у сябе цэлы гарэм „рабыняў каханьня”. Яны ў трывожнай зьнямозе чакалі вяртаньня з працы свайго пана, і калі чулі набліжанае гудзеньне матора ягонага самаходу, дык высоўваліся ў вакно з прывітальнымі сьпевамі. Дык вось мой бацька з сябрамі навучыліся падрабляць з дапамогай адмысловага мэталёвага кола гудзеньне таго самаходу. І часьцяком запускалі гэтую „тарахцёлку”. Пачуўшы знаёмыя гукі, прастытуткі высоўваліся ў вакно і пачыналі сьпяваць. А дзеці заходзіліся ад рогату, бо ніякі самаход не прыязджаў! Урэшце, „рабыні каханьня” выкрылі парушальнікаў іхняга спакою і больш не сьпявалі.

У доме Эрых Шот трымаў мажнага бульдога. Сабака быў добра натрэніраваны і хапаў свае ахвяры мёртвай хваткай. Зазвычай ён любіў сядзець ля дзьвярэй свайго гаспадара. Таму па вуліцы побач з хатай ССмана трэба было праходзіць павольна, бяз рэзкіх рухаў, каб ня выклікаць агрэсію ня менш грознага сабакі. Аднойчы Юрка Сова праігнараваў папярэджаньні сяброў і вырашыў прабегчыся пад носам у бульдога! Сабака ў адным скоку схапіў Юрка за дупу і не адпусьціў. Хлапец заверашчаў на ўсю Блюхерштрасэ, пакуль з дому ня выскачыў афіцэр і са страшнай лаянкай, скіраванай як на бульдога, так і на Юрка Сову, не забраў сабаку дадому…

Нямецкія акупацыйныя ўлады ўдала разыгралі нацыянальную карту, пасварыўшы палякаў зь беларусамі і нацкаваўшы іх разам

супраць жыдоў. Зрэшты, так званыя *Kresy Wschodnie* заўсёды былі вельмі складаным этнакультурным рэгіёнам, бо карэнныя беларусы не любілі польскіх асаднікаў у міжваенны пэрыяд, а жыдоўскія пагромы здараліся яшчэ ў часы царскай Расеі.

Паводле зьвестак нямецкіх акупацыйных уладаў, на 29 ліпеня 1941 году ў Гродне пражывала 21500 палякаў, 18560 жыдоў, 5200 беларусаў, 2060 рускіх, 122 фальксдойчы, 48 літоўцаў і 320 чалавек іншых нацыянальнасьцяў. Натуральна, што немцы рабілі стаўку ў першую чаргу на фальксдойчаў, якія павінны былі прадастаўляць радаслоўную і даказаць сваю прыналежнасць да нямецкай нацыі. У Гродне акупацыйныя ўлады прадугледжвалі пакінуць толькі 20 тысячаў мясцовых жыхароў і пасяліць 10 тысячаў нямецкіх каляністаў. Жыдоў сагналі ў два геты, якія ў сакавіку 1943 году былі зьліквідаваныя. Паводле справаздачы гарадзенскага павятовага камісара фон Плетца ад 5 сакавіка 1943 году шэфу грамадзянскай управы Беластоцкай акругі, у канцэнтрацыйныя лягеры было вывезена 20 577 жыдоў...

## Фальксдойчы і Крушэўскі

Мае продкі былі добра знаёмыя зь некаторымі фальксдойчамі – жылі ж у адной дзяльніцы. Сярод фальксдойчаў варта згадаць пра радзіну Вагнэраў, дом якіх няблага захаваўся й дагэтуль. Цяпер у ім разьмясьціўся салён татуіровак, нібы згадка пра скандальнавядомага ў паваенныя савецкія часы актора Гарадзенскага драматычнага тэатра Мікалая Вагнэра. Мікалай Вагнэр шакіраваў зацюканых саветаў сваёй артыстычнай паставай. Ён хадзіў у доўгім чорным плашчы з накінутым паверх і апавітым некалькі разоў вакол шыі доўгім белым шалікам, у дадатку меў яшчэ адзін атрыбут - чорны каўбойскі капялюш. Шпацыраваў актор па горадзе з прыручанай варонай на плячы. Элементам экстравагантнасці былі таксама белыя пальчаткі, якія ён дэманстратыўна доўга, па-тэатральнаму, здымаў, калі купляў нешта на мясцовым рынку. Ягоны малодшы брат Віктар ажаніўся са сваёй настаўніцай і, здаецца, зьехаў у сталіцу. Але ўсё гэта было ўжо пасьля вайны. Згаданы і прыгожы ў архітэктурным сэнсе дом збудаваў іх бацька, які быў яшчэ ў міжваенны час вядомым ў Гродне столярам.

Мая прабабка Алена Сарока і бабка Галіна сябравалі з радзінай Кальхэртаў. Стары Кальхэрт падчас акупацыі быў кіроўцам у нейкай нямецкай фірме і надта ж любіў, паводле старой нямецкай традыцыі, піць скрынкамі піва. Мой бацька ўспамінаў, што іх,

маллетніх хлапчукоў, надта ж забаўляў ягоны трохколавы самаход. Зрэшты, стары Кальхэрт добра разьбіраўся ў мотатэхніцы, і нават пасьля вайны, у пачатку 1960-х дапамог майму бацьку адрэмантаваць сапсаваны ў выніку аварыі матацыкл.

Падчас акупацыі ў маёй прабабкі Алены Сарокі на кватэры жыў колішні сяржант польскага войска Крушэўскі. Ён яшчэ пры паляках меў вялікі поцяг да сьпіртнога, таму й разыйшоўся з жонкай. Саветаў ён страшэнна баяўся, затое пры немцах акрыяў, уладкаваўшыся кіроўцам у кантору Reifaisen. Езьдзіў ён на савецкім грузавіку ЗИС-5 з газагенэратарным рухавіком.

– Дзіўны гэта быў рухавік, – згадвае мой бацька Ігар Гумянюк. - За кабінай былі дзьва бакі, у адным зь якіх знаходзіліся невялічкія драўляныя цуркі. Яны пры спальваньні выпрацоўвалі газ. Таму машына, як сёньня гэта ня дзіўна, заводзілася з дапамогай запалак!

Крушэўскі развозіў прадукты харчаваньня, а таксама зерне на млын. І, натуральна, заўсёды знаходзіў магчымасьць змахляваць і напіцца. Адметна тое, што ён, нават моцна пьяны, добра вадзіў грузавік, але, калі ставаў на зямлю, дык валіўся з ног. Таму мая прабабка цягнула яго дамоў, каб не валяўся пад плотам і не трапляўся, барані Божа, на вочы ССманам, якія жылі зусім побач. З другога боку, Крушэўскі быў вельмі прыдатны, бо меў мажлівасьць прывезьці дэфіцытнага зерня для кураў.

Найбліжэйшы млын знаходзіўся ў будынку насупраць заапарку. Належаў ён немцам, але й там мелася магчымасьць змалоць тое зерне, чым многія гараджане і сяляне з навакольных вёсак карысталіся. Акрамя таго, непадалёк дому маіх продкаў (цяпер вул. 17 верасьня) знаходзілася прыватная пякарня пана Гарсткі, у якую заўсёды былі вялізныя чэргі па хлеб, бо выдаваўся ён усё ж па нямецкіх картках. Паколькі не заўсёды ўдавалася набыць хлеб у той пякарні, дык часам, калі знаходзіліся нейкія запасы мукі, хлеб пяклі ў хаце. Прычым пяклі не на лісьце капусты, як гэта рабілі на вёсцы, а ў адмысловай мэталёвай процьвені, бы сапраўдны пірог!

## Культурная альтэрнатыва

Нягледзячы на ўсе жахі акупацыйнага пэрыяду, людзі ў Гродне жылі „ня хлебам адзіным". Каб не перарываць працэс адукацыі, многія дзеці (чые бацькі на тое маглі сабе пазволіць) займаліся ў прыватных настаўнікаў. У маёй цёткі Таісы захаваўся альбом (дзяўчаты ў падлеткавым ўзросьце некалі заўсёды рабілі альбомчыкі з прыгожымі карцінкамі) з малюнкам прыватнай

настаўніцы, якая жыла на вуліцы Аградовай (цяпер М.Багдановіча). Карысталіся посьпехам прыватныя заняткі ў паняў Будрэвічовай, Барэвічовай, Асканавай.

А вось радзіна Лютэровічаў, якія жылі на вуліцы Рэйманта, арганізавала сямейны тэатар. Прыбралі ў вялікім сараі адну сьцяну, выйшла цалкам неблагая сцэна. У якасьці актораў выступалі зазвычай дзеці. Для іх гульня ў актораў была адначасна і формай адукацыі, бо спэктаклі ставіліся паводле літаратурнае клясыкі. Публіка – суседзі з навакольных вуліц – сядзела на расстаўленых у агародзе лаўках. Агарод у Лютэровічаў быў вялікі, і кожны прадстаўнік радзіны меў у ім сваю дзялку, на якой вырошчваў жыцьцёванеабходныя рэчы. Дзівацтвам (а мо сквапнасьцю?) можна палічыць тое, што прадукты з тых дзялак кожны зь Лютэровічаў хаваў пад сваім ложкам.

У асабняку на скрыжаваньні сучасных вуліц Рэйманта і Астроўскага, які на схіле СССР „прыхватызаваў" сабе забіты ў верасьні 1993 году кілерам мафіі старшыня гродзенскага аблвыканкаму Дзьмітры Арцыменя, перад вайной жыў настаўнік літаратуры („учитель изящной словесности»), які меў багатую бібліятэку. Нямецкія афіцэры, якія пасяліліся на першым паверсе асабняку, загадалі павыкідаць тыя кніжкі на вуліцу.

Сапраўднай сэнсацыяй у культурным жыцьці Гродна падчас нямецкай акупацыі стаўся канцэрт саліста Міланскага опэрнага тэатра і Нацыянальнага тэатра ў Празе Міхася Забэйды-Суміцкага, арганізаваны Беларускім Нацыянальным Камітэтам (БНК) у Беластоку. Філія БНК дзейнічала і ў Гродне. Мая бабуля Галіна пасьля доўга ўспамінала гэты канцэрт, гаворачы, што выступ Міхася Забэйды-Суміцкага быў „промнем сьвятла ў цямрэчы" і нагадваў пра шчасьлівыя 20-30-я гады...

Актыўна дзейнічала ў пэрыяд нямецкай акупацыі і „Рускае таварыства" („Русский комитет»), адным зь дзеячаў якога быў Канстанцін Іванавіч Драздоўскі (пасьля вайны - сьвёкар маёй цёткі Таісы). Пра яго мне ўжо даводзілася распавядаць раней. Удзельнічаў Драздоўскі ў гэтым таварыстве толькі таму, што яно мела моцны праваслаўны ўхіл. А Канстанцін Іванавіч сьпяваў у хоры Пакроўскага сабору і быў набліжаны да архібіскупа Бенядзікта. У той час асабістым кіроўцам архерэя быў Аляксей Рымарчук, які жыў у доме на скрыжаваньні цяперашніх вуліц Славацкага і 17 верасьня. Аляксей таксама прыгожа сьпяваў, а пасьля вайны стаў служыць у царкве дыяканам. Зьбіралася праваслаўная інтэлігенцыя на „пасядзелкі" ў доме хроснай майго бацькі Лідзіі Сямашкі. Яе двухпавярховы дом не захаваўся, ён знаходзіўся на рагу цяперашніх вуліц Дзяржын-

скага і Першага мая, перад дыхтоўнай камяніцай, якая належала да вядомай у міжваенны пэрыяд лякаркі-дантысткі Яніны Сыртаўт (Janina Syrtowtt). У адной з кватэраў той камяніцы ў 1944-1951 гг. жыў вядомы беларускі кампазытар і грамадзкі дзеяч Рыгор Шырма. На камяніцы ў ягоны гонар усталявана мемарыяльная шыльда.

## Чырвоная шуба рабіна

Паколькі таксовак у сёньняшнім разуменьні гэтага слова падчас акупацыі не было, дык нармалёва працавалі *dorożki*. *Doróżkarzami* былі ў асноўным беззямельныя мужыкі з паблізкай вёскі Пярэселка (*Przesiółka*). Акрамя гэтай прафэсіі, многія зь іх былі паробкамі ў багацейшых гаспадароў Кізюкевічаў, Аніськаў і Арановічаў ці наёмнымі музыкамі, што гралі ды сьпявалі на вясельлях ці іншых урачыстых імпрэзах. Адтуль і пайшла прымаўка „*Orkiestra gra – Przesiółka tańczy*". *Doróżkarzem* быў таксама і мой другі дзед (бацька маці) Казімер Друцкі (1903-1977). Ён меў дарожку з шыкоўным скураным капюшонам і вельмі разумнага каня, які заўсёды прывозіў п'янага заснулага гаспадара дадому. Больш за тое, нават грукаў дышлам у вароты, каб гаспадыня адчыніла браму. Нападпітку дзед Казімер сьпяваў характэрныя для жыхароў Пярэселкі прыпеўкі, кшталту:

*A mój ojciec furman furman.*
*Co zarobi – wszystko kurwam.*
*A jak nic on nie zarobi,*
*To go pochowają w grobie…*
……………………………
*Jeden tydzień terpentyna.*
*Drugi tydzień margaryna.*
*A na trzeci grecznia kasza.*
*Pierdolone życie nasze…*

ССман Эрых Шот, які жыў па суседзтву ў былым доме доктара Беклемішава, па сьвятах таксама замаўляў сабе *doróżkarza*, хаця й меў службовы самаход. Але ж яму хацелася праехацца з форсам. Прычым „на службе" ў Эрыха Шота быў той самы *doróżkarz*, які езьдзіў у чырвонай шубе жыдоўскага рабіна, нібыта падараванай яму ССманамі пасьля экзэкуцыі групы мясцовых жыдоў. Людзі пляткарылі, што той *doróżkarz* быў адмыслова прыстаўленым да Эрыха Шота савецкім шпіёнам і меў сувязі з пракамуністычнай партызанкай. Што б там не пляткарылі, але ён зьнік бясьсьледна разам зь немцамі падчас наступленьня саветаў на Гродна.

Выкарыстоўваючы замяшальніцтва падчас адступленьня немцаў, ягоныя калегі-*dorożkarze* зь Пярэселкі прыехалі, нягледзечы на страляніну, пад дом Эрыха Шота, высадзілі ламамі дзьверы і набралі сабе нямецкага дабра столькі, колькі зьмясьцілася ў павозкі, ды хуценька зьехалі. Мой дзед Юзаф прыцягнуў адтуль прыгожы круглы стол. Яго зрабілі для высокапастаўленага ССмана жыды з гарадзенскага гета. Гэты стол і цяпер упрыгожвае мой пакой. А вось Канстанціна Іванавіча Драздоўскага прывітаў той самы бульдог, што некалі на вуліцы схапіў за дупу хлапчука Юрка Сову. Дый так прывітаў, што не выпускаў Канстанціна Іванавіча з пакою. Як толькі Драздоўскі пасунецца ў бок дзьвярэй, бульдог кідаецца на яго. Ён некалькі гадзінаў прасядзеў пад наглядам бульдога ў крэсьле, пакуль ня сьцяміў, як выбрацца з гэткае масткі. Выратавала нямецкая каска, што валялася на падлозе. Канстанцін Іванавіч падфудволіў тую каску і, пакуль сабака кінуўся за ёй, выскачыў куляй з пакою!

## „Бомба зэгарова"

Падчас наступу саветаў ад бамбардыровак хаваліся ў падвалах дома інжынэра-чыгуначніка Астроўскага[3]. Гэта былі вялізныя, як для такога асабняка, памяшканьні, у якіх зьмяшчалася больш за сотню людзей. Прыходзілі хавацца сюды людзі з усіх навакольных вуліц. Прабабка Алена Сарока хавалася ў падвале сваёй хаты, бо трэба было пільнаваць маёнтак ад злодзеяў, для якіх бамбёжка – па-шчасьліваму спрыяльная нагода для рабунку.

– У падвалах дома Астроўскага набівалася столькі людзей, што яблыку не было дзе ўпасьці, – успамінае мой бацька. – Людзі прыцягвалі сюды коўдры і матрацы, самыя неабходныя рэчы. Памятаю, як ноччу мне страшэнна хацелася сікаць, і я ўпоцемку на кагосьці насікаў. Адна жанчына катала каляску зь дзіцем. Так мерна: „Тах-тах, тах-так, тах-тах", што вельмі нагадвала хаду гучнага будзіка. Дык нехта з панікёраў як закрычыць: „Proszę państwa! Tu podłożona bomba zegarowa!"

Аднаго разу ў падвал прыйшоў зьбеглы з фронту немец, які ўжо не хацеў ваяваць. Людзі страшэнна напалохаліся ўзброенага дэзэртыра, бо падумалі, што іх зараз павядуць на расстрэл. Але немец здаў зброю, раздаў людзям свой паёк, стаў паказваць свае дакумэнты, сямейныя фотаздымкі. Ён папрасіў схаваць яго да прыходу саветаў, а пасьля перадаць ім…

---

3 Зараз камяніца па вул. Астроўскага №11.

## Настальгія па „райскім садзе”

Праглядаючы здымкі свайго дзяцінства, я крыху сумую па тых „бесклапотна-ружовых” часах, калі ўсё навокал патанала ў веснавой квецені і водар кветак урываўся ў расчыненае акно. Тады я, пэўна, не разумеў, што сад і агарод быў патрэбны дзеду і бабцы не дзеля раскошы. Ён іх карміў. Савецкая ўлада, адабраўшы ў прыватных уласьнікаў апошняе, пакінула адно надзею на выжываньне. Утрыманьне саду ў 1960-70-я гады давала нейкі эфэкт. Тады рынкі не былі завалены, як сёньня, экзатычнымі бананамі, ківі ці ананасамі. Мандарынкі савецкім хлопчыкам і дзяўчаткам у дзіцячых садках ці ў школках даставаліся адно пад елачку на Новы год ці яшчэ па якіх значных сьвятах. У нас заўсёды было шмат вішняў, яблыкаў, грушаў, сьліваў, грэцкіх арэхаў і мора кветак. Ня кажучы ўжо пра звычайную гародніну. Бабуля штодня сядзела на Грандзіцкім рынку, а дзед падвазіў тавар.

Наколькі я памятаю, тадышнія бабулькі і дзядулькі адрозніваліся ад сёньняшніх. Гэта былі парэшткі старой гарадзенскай шляхты ды інтэлігенцыі, што не здолела (ці не схацела) рэпатрыявацца ў Польшчу. І гандлявалі яны садавінай і гароднінай не з атрыманых ад савецкай дзяржавы лецішчаў (як цяпер), а з уласных агародаў, што захаваліся яшчэ з польскага часу. Мне запомніліся іх адухоўленыя твары і своеасаблівыя манэры паводзінаў. Яны істотна адрозьніваліся ад пазьнейшых калгасна-пралетарскіх грымасаў. Даўно няма ўжо тых крэсавякаў. Замест іх гандлююць цяпер інтэлігенты новай генэрацыі – колішнія выкладчыкі, лекары, інжынэры. І стаяць яны на тых рынках не ад няма чаго рабіць. Цяпер іх не называюць, як у часы Брэжнева, спэкулянтамі. Цяпер яны прадпрымальнікі!

І я разумею, чаму мой бацька Ігар Гумянюк у 1970-я не падносіў бабулі на базар вёдры зь вішнямі. Бо той Грандзіцкі рынак знаходзіўся побач з гарадзенскім райвыканкамам, дзе ён працаваў інструктарам.

## Міт Крэсаў будзе жыць доўга

Упрынцыпе, я шмат чым абавязаны свайму дзеду Іосіфу Раманавічу Гуменюку. Гэта ён збольшага адыграў галоўную ролю ў фармаваньні майго „несавецкага” сьветапогляду. Каб не ягоны няўрымсьлівы характар і дзейнасьць, дык не было б гэтага нарысу ды іншых твораў. Ён, канешне, ухваляў мае літаратурныя

пачынаньні, але жадаў, каб я знайшоў сабе больш практычны занятак. За некалькі дзён да сьмерці, лежачы ў ложку, ён мне сказаў: „Вершыкі вершыкамі, але я хацеў бы, каб ты здабыў прафесію, зь якой можна было б прыстойна жыць. Напрыклад, стаў бы, як і я, геадэзістам ці вывучыўся б на архітэктара, будаваў масты...”

Ну так, у часы Другой Рэчы Паспалітай асобы гэтых „практычных прафесій” былі паважанымі людзьмі і шматараблялі. Магчыма, калі б я пайшоў па сьлядах дзеда, дык ня так мучыўся бы ў пошуках праўды жыцьця. Шануючы свайго дзеда, я на ўласныя грошы паставіў яму помнік у форме двухмэтровага белага крыжа. 19 верасьня дзеду споўнілася б 111 гадоў. Цікавая лічба – тры адзінкі...

На памінках дзедавай дачкі і сваёй цёткі Таісы Драздоўскай я выступіў з прамовай, у якой згадаў тых, пра каго напісаў у гэтым нарысе-сэрыяле, і прапанаваў памянуць іх усіх – старую гарадзенскую інтэлігенцыю, за што прысутныя выказалі мне шчырую падзяку. Тым больш некаторыя зь іх згадваліся ў маім творы. Праз колькі дзён да нас завітала мая дваюрадная сястра Ніна Драздоўская (у замужжы Якуцэвіч), каб памянуць з маім бацькам памерлую Таісу. Яна настолькі была ўражаная публікацыяй, што не магла стрымаць свайго энтузыязму: – А чаго ж ты раней не сказаў, што друкуеш такую рэч? Гэта ж настолькі будзе цікава для моладзі, якая анічога ня ведае пра побытавае жыцьцё старых гарадзенцаў!

Яе сын Сяргей – студэнт Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Я. Купалы – менавіта праз лучнасьць з той побытавай гісторыяй сваіх продкаў зацікавіўся беларушчынай і стаў сапраўдным патрыётам малой радзімы. Ён лічыць, што радзіма – гэта найперш тое месца, дзе ты нарадзіўся, а пасьля – ўсё астатняе.

Таму, як бы не шчыравалі сёньняшнія афіцыёзныя ідэолягі-прапагандысты, імкнучыся пазбавіць тутэйшы люд гістарычнай памяці і нацыянальнай сьвядомасьці, міт Крэсаў, як мэтафізычны панятак, як прыгожая рамантычная мэтафара малой радзімы, будзе жыць доўга ў памяці ня толькі людзей старэйшага пакаленьня. Да гэтага міту ўсё часьцей горнецца патрыятычна настроеная моладзь, якая зразумела, што зь іхнімі продкамі зрабіла савецкая ўлада. Цяпер нашчадкі той улады абалваньваюць моладзь расейскамоўнай папсовай музычкай і байкамі пра „вызваленьне ад нямецка-фашыстоўскіх захопнікаў”, каб тая не цікавілася сапраўднай беларушчынай, каб выраклася сваіх каранёў, забылася на пакуты сваіх продкаў. Але ж ці можна чалавека назаўсёды пазбавіць генатыпу, адарваць цалкам ад сям’і, ад кроўнай повязі з продкамі?

Пытаньне рытарычнае...

# О реконструкции Старого замка в Гродно

**Степан Стурейко (Гродно)**

Старый замок является одной из замечательных достопримечательностей города Гродно. Наряду с Борисоглебской церковью XII в. и костелами XVII – XVIII вв. он создает неповторимую, направленную в историю атмосферу города и при этом имеет существенные особенности, выделяющие его из других наших памятников. Главная особенность заключается в том, что замок носит практически сакральный характер для трех взаимосвязанных культур – белорусской, литовской и польской, ибо с ним сопряжена история государства трех этих культур – Великого княжества Литовского и Речи Посполитой. Кроме того, Старый замок до сих пор находится в весьма неприглядном состоянии, стушевывающем в глазах непросвещенного наблюдателя его выдающуюся роль в нашей истории. Однако в последнее время гродненские власти, уже успевшие прославиться чуть ли не на всю Европу своими амбициозными проектами «реконструкции» городского историко-культурного наследия, решили провести его ремонт. Ввиду важности вопроса реконструкции замка, автор настоящей статьи считает необходимым, во-первых, обратить внимание на несколько нюансов проекта Владимира Бочкова, во-вторых, поделиться некоторыми собственными соображениями на счет принципиальных подходов к решению судьбы памятника. Тем более важным мне кажется то, что статья написана еще до начала реализации известного проекта архитектора Бочкова и вполне вероятно, могла бы послужить источником для его необходимой доработки[1].

Начало реализации каждого проекта в гуманитарном знании обязательно должно предваряться анализом творческих наработок предшественников. Отношения архитекторов с историческими объектами несомненно роднят архитектуру с исторической наукой. Поэтому очень важное значение для осознания проблемы реконструкции занимает рассмотрение истории вопроса «воссоздания» Старого замка.

Нет никакой необходимости в данной статье пересказывать историю развития архитектурного облика здания (или даже комплекса) Старого замка. Вопрос о его реконструкции впервые встал только в середине 20-х гг. XX в. До того времени имели место только переделки, ремонты, «улучшения» и т.д. Целью же восстановления одного из предыдущих обликов замка задалась польская городская администрация. Надо сказать, что произошло это на фоне настоящего реставраторского бума, охватившего межвоенную Польшу в первое десятилетие ее независимости.

В большей степени нежели какими-либо другими предпосылками для реконструкции Старого замка стали идейно-политические мотивы. Тем не менее все должно было проводиться на строгой научной основе. Историки знают, что Старый замок в Гродно можно представить как бы немой антитезой Новому замку. Новый замок, построенный в XVIII в., остался в польской и белорусской истории напоминанием о событиях конца XVIII в. – разделах Речи Посполитой и отречении ее последнего короля Станислава Августа Панятовского. С вершины противоположного холма на него как бы с укоризной смотрит Старый замок, свидетель славных времен того же государства.

Старый замок сохранял готический облик вплоть до конца 70-х гг. XVI в., когда король Речи Посполитой Стефан Баторий перестроил его в стиле маньеризма. Фактически, гродненский замок стал главной резиденцией этого короля, постоянно занятого продолжительными войнами с Москвой, а затем и местом его смерти (1586 г.). Замок перестраивался после разрушений 1655 и 1702 гг. во время новых войн с Московским царством и Швецией. Дальнейшие существенные изменения внешнего вида бывшей монаршей резиденции произошли в XIX в., когда старинный замок был превращен в клуб для офицеров российского гарнизона. В результате этих преобразований от Старого замка остались только точное положение на «родном» фундаменте, часть старых наружных стен, подвальные помещения.

В период недолгого существования II Речи Посполитой состояние гродненского замка не претерпело изменений. Он продолжал служить военным клубом и госпиталем. Наконец в 1927 г. солдаты покинули замок, и перед властями встал вопрос о его дальнейшем использовании. Возникшее в 1928 г. военное Замковое «управление» начало подготовку к его реставрации, однако в течение следующих лет Министерство общественных работ неизменно отказывало в

субсидировании данного предприятия. Заброшенное строение, частично разрушенное и изменившее свой вид особенно сильно в период оккупации, теперь ничем не напоминало давней славы и той важной роли, которую оно играло в жизни двуединой страны.

Вместе с тем власти отдавали себе отчет в исторической ценности этого объекта наследия (огромную роль в этом сыграл основатель Гродненского музея Юзеф Ядковский) в его связи с важными историческими событиями и в особенности с фигурой исключительно популярного в период II Речи Посполитой короля Стефана Батория. Именно он был тем человеком, который, как и популярный тогда и теперь маршал Ю. Пилсудский успешно противостоял «извечному восточному врагу» Польши – России. Поводом для роста внимания к судьбе памятника стала 350-я годовщина смерти Батория.

Как уже упоминалось, реставрационная активность в межвоенной Польше была весьма высокой. Были восстановлены важнейшие польские исторические святыни, как-то: краковский Вавель, королевский дворец в Варшаве, Старый рынок в Варшаве, множество поврежденных войной исторических зданий, городские ратуши, костелы, переделанные русскими чиновниками в православные церкви и т.д. К сожалению, до наследия, размещенного на окраинах государства – во Львове, в Вильно (там, в частности, был достроен третий ярус «башни Гедимина») и в Гродно руки дошли в последнюю очередь. Как оказалось, поздно. Финансовые средства государства и патриотический запал благотворительности граждан были истощены, а вскоре началась война, положившая конец II Республике.

В 1933 г. по инициативе белостокского воеводы и под патронатом президента Польши И. Мостицкого, а также Ю. Пилсудского возник Воеводский комитет по увековечению памяти короля Стефана Батория в Гродно. Целью его деятельности стал сбор средств на возрождение гродненского Старого замка и консервацию замкового холма. Через два года VI всеобщий съезд польских историков, который проходил в Гродно, принял решение о начале действий, направленных на спасение и консервацию всех объектов наследия замкового холма. Участники съезда также выразили желание чтобы гродненский замок был в самом скором времени отстроен и нашел предназначение, соответствующее его исторической роли. Проект реставрации должен был быть выбран в ходе архитектурного конкурса.

В 1936 г. Комитет по увековечению памяти короля Стефана Батория издал монографию о памятниках замкового холма и, в частности, о Старом замке, «единственном сохранившемся на тер-

ритории Польши архитектурном памятнике, помнящем Великого короля Стефана Батория, который именно в Гродно готовил победоносные походы на Восток для усиления Речи Посполитой и в замке же закончил свою героическую жизнь». Отсылка к личности выдающегося вождя и стратега, которым являлся король, придавала дополнительный смысл факту принадлежности здания замка польскому военному ведомству (Историко-археологический музей был перемещен туда только в 1931 г.).

В июле 1936 г. по представлению министра народного образования Ярослав Мариан Войтеховский[2], один из видных теоретиков-реставраторов Польши того времени, был назначен для проведения исследований в связи с планируемым восстановлением замка и определения основных требований к итоговому проекту реконструкции.

Вопросу реставрации гродненского замка также была посвящена вторая часть XXII Всепольского Съезда консерваторов в 1937 г. в Варшаве. Его участники постановили, что в первую очередь следует обеспечить нормальные водостоки с замкового холма, а предполагаемое восстановление должно идти в направлении реконструкции, опирающейся на исследования профессора Я. Войтеховского. Окружной консерватор считал, что исследования принесли столько материала, что можно говорить о реконструкции замка и возврате ему исторического вида. Тем самым был отброшен более ранний проект реставрации замка авторства архитектора Брунона Зборовского, основанный на ликвидации вторичных напластований внутренностей замка и перестройке крыши.

Новый план реконструкции предполагал восстановление четырех ренессансных эркеров, проектирование ренессансной аттики на всем здании, а также первоначальной лестницы и террасы со стороны парадного входа. Далее шло частичное восстановление и реконструкция внешних оборонительных стен и башен, а также корректировка внутренней планировки. Работы эти должны были следовать за археологическими исследованиями, устанавливающими расположение исторических фундаментов. Предполагалась также создание экспозиции найденных на замковой горе артефактов. Для нужд военной администрации планировалось построить рядом с замком отдельное новое здание.

Проект Я. Войтеховского был плодом его вдумчивых исследований, которые охватили доступные в то время исторические источники, а также материальную структуру самого объекта. Плани-

И облисполком, и епархия, и прихожане, и жители, все хотят видеть тот вариант Борисоглебской церкви, который будет утвержден «радой». Осталось только нам достичь единодушия. Я предлагаю честную и чистую консервацию – двускатную крышу с двух сторон перекрыть деревянными конструкциями, как это сделано во многих христианских церквах. При реставрации подобных уникальных произведений архитектуры, согласитесь, должен быть высокий уровень щепетильности. Возможно, общество созреет до понимания, что потратить деньги нужно один раз, но с умом. А пока лучше легкая консервация, которую можно в будущем разобрать, не нанося ущерба сохранившемуся артефакту.

Советская Белоруссия № 173 ад 27 сакавіка 2008 г.
http://sb.by/post/vokrug_kolozhi/

# Байкот

**Алесь Смалянчук (Горадня)**

У красавіку 2008 г. шэраг беларускіх гісторыкаў байкатавалі правядзенне канферэнцыі “Горадня і гарадзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі”. Канферэнцыя, галоўнымі арганізатарамі якой выступалі гістарычны факультэт ГрДУ імя Я.Купалы (кафедра гісторыі Беларусі (загадчык І.Крэнь), і Гарадзенскі гарвыканкам (А.Антоненка), была прымеркаваная да 880-годдзя заснавання гораду. Байкот быў выкліканы тым, што арганізатары канферэнцыі ў апошні момант выкраслілі са складу яе ўдзельнікаў двух гісторыкаў – Алеся Смаленчука і Аляксандра Краўцэвіча.

Вось якая інфармацыя з’явілася ў тыя дні на інтарнет-сайтах:

**www.harodnia.com**
**Гарадзенскіх гісторыкаў Алеся Смаленчука і Алеся Краўцэвіча выкінулі з праграмы юбілейнай канферэнцыі**

10 красавіка ў Гродзенскім універсітэце імя Янкі Купалы пройдзе канферэнцыя, прысвечаная 880-годдзю Гродна (якое, дарэчы, было ў мінулым годзе). Паколькі канферэнцыя фінансуецца гарвыканкамам, то складанне яе праграмы таксама праводзілася пад кантролем гарадскіх чыноўнікаў.

Першапачаткова з праграмы была выкінута большая частка пленарнага паседжання, тая, дзе пасля афіцыйных віншаванняў, ішлі навуковыя даклады. Пасля пад усціскам гарвыканкама з праграмы канферэнцыі наогул былі выкінуты імёны беларускіх даследчыкаў, якія найбольш актыўна праявілі сябе ў справе абароны гістарычнага цэнтра Гродна: доктара гістарычных навук, былога прарэктара ГрДзУ А.Краўцэвіча (археолага, аўтара манаграфіі аб стварэнні ВКЛ, складальніка мапы археалагічнай ахоўнай зоны Гродна) і доктара гістарычных навук Алеся Смаленчука, аднаго з ініцыятараў спробы правесці гарадскі рэферэндум у справе пабудовы чацвёртага моста. Затое ганаровы даклад на канферэнцыі будзе чытаць адзін з галоўных “рэканструктараў” горада галоўны архітэктар Ул.Анісімаў.

**http://www.zasvobodu.net/news/U-Goradn-g-storyk-baikatujuc-a/**
**У Горадні гісторыкі байкатуюць афіцыйную канфэрэнцыю**
**08.04.2008 22:22 - Крыніца: Наша Ніва**

Тым самым яны выказваюць салідарнасьць з выкрасьленымі са складу ўдзельнікаў «нячэснымі» дасьледчыкамі: Алесем Краўцэвічам і Алесем Смаленчуком.

10 красавіка ў мурах Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы мае прайсьці канфэрэнцыя, прысьвечаная 880 годзьдзю Горадні. Як паведамляў

сайт nn.by са складу ўдзельнікаў былі выкрасьленыя «нячэсныя гісторыкі»: Алесь Смалянчук і Алесь Краўцэвіч.

8 красавіка справа атрымала працяг. Як паведаміў nn.by Павал Мажэйка, некалькі гісторыкаў -- Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Вольга Сабалеўская, Эдуард Мазько, Іна Соркіна, Андрэй Чарнякевіч, Анатоль Трафімчык, Віталь Карнялюк, Сяргей Токць, Юры Гардзееў - у знак пратэсту супраць выкіданьня Краўцэвіча і Смаленчука вырашылі адмовіцца ад удзелу ў канфэрэнцыі.

Пра гэта яны паведамілі на імправізаванай прэс-канфэрэнцыі, што прайшла ў аўторак у другой палове дня. Паводле меркаваньня гісторыкаў, сьпіс тых, хто адмовіўся, будзе расьці. Яшчэ больш за дзесяць гісторыкаў не далучыліся да салідарнай заявы — іхнае становішча з розных прычынаў ім таго не дазваляе, — аднак прагаласуюць нагамі, г.зн. проста не прыедуць на канфэрэнцыю. Сярод іх таксама і супрацоўнікі Інстытуту гісторыі Нацыянальнай Акадэмі навук, ВНУ і музэяў.

Гісторыкі заяўляюць, што «адмаўляюцца ад удзелу ў канфэрэнцыі ў знак салідарнасьці з Алесем Краўцэвічам і Алесем Смаленчуком, якіх выдалілі са сьпісу ўдзельнікаў канфэрэнцыі». Андрэй Чарнякевіч, які выступаў ад імя гэтых гісторыкаў, зазначыў, што Смалянчук і Краўцэвіч шмат зрабілі для дасьледаваньня і абароны гістарычнага цэнтра Горадні, і выдаленьне іх абуральнае, пагатоў канфэрэнцыя адкрытая і ўзяць удзел у ёй можа любы дасьледчык. Таксама былі скрытыкаваныя закіды наконт палітызаванасьці меркаваных выступаў Смаленчука і Краўцэвіча. Алесь Смалянчук, напрыклад, падаў тэму дакладу «Горадня на старонках «Нашай Нівы» (1906-1911)». У прыватнай гутарцы Алесю Смаленчуку сказалі, што рашэньне пра выкіданьне прымалася не кіраўніцтвам Гарадзенскага ўнівэрсытэту, а аддзелам ідэалёгіі гарвыканкаму.

У той жа час у размове з гісторыкамі начальнік ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму Сяргей Дубавец (цёзка знанага публіцыста) заявіў, што нічога ня ведае аб матывах адмовы і выказаў меркаваньне, што рашэньне аб выключэньні гісторыкаў было прынята ва ўнівэрсытэце. Ён парадзіў схадзіць да намесьніцы старшыні гарвыканкаму Сенчанковай. Да тае гісторыкаў, натуральна, не пусьцілі...

Варта адзначыць, што начальнік ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму сам выпускнік гарадзенскага гістфаку. У 90-я ён пісаў патрыятычныя артыкулы ў навуковыя зборнікі.

**Інфармацыя з сайту беларускай студыі "Радыё свабода": 04/10/2008 - 14:33 / Радыё Свабода**

Гарадзенскія гарадзкія ўлады 10-11 красавіка праводзяць навуковую канфэрэнцыю "Горадня і гарадзенцы: дзевяць стагодзьдзяў гісторыі", прымеркаваную да 880-х угодкаў гораду, што будуць адзначацца ў чэрвені. Сярод арганізатараў таксама — Акадэмія навук і Гарадзенскі унівэрсытэт.

Стала вядома, што ўдзельнічаць у мерапрыемстве адмоўлена двум дактарам гістарычных навук. Гэта – Алесь Смалянчук і Алесь Краўцэвіч,

абодва даўно жывуць у Горадні і займаюцца яе гісторыяй. Салідарнасьць зь імі выказалі яшчэ каля паўтара дзясятка навукоўцаў.

Сёньня спадары Смалянчук і Краўцэвіч сабралі журналістаў, каб паведаміць ім пра здарэньне і сваю пазыцыю. Салідарнасьць са Смаленчуком і Краўцэвічам выказаў іхні калега кандыдат гістарычных навук Андрэй Чарнякевіч: "Шкада, што ў сёньняшняй сытуацыі атрымалася так, што людзям, якія шмат зрабілі у вывучэньні гісторыі Горадні, адмовілі ў магчымасьці прыняць удзел. Асабіста я ня бачу магчымасьці прымаць удзел у гэтай канфэрэнцыі я вымушаны адмовіцца. Акрамя мяне такую ж пазыцыю занялі цэлы шэраг гарадзенскіх, менскіх, гомельскіх гісторыкаў. Сярод іх вядомыя ўсім нам прозьвішчы Сагановіча, Кіштымава, Сабалеўскай, Соркінай, Масько, Трафімчыка, Карнелюка, Токця, Гардзеева".

Сваю пазыцыю выклаў Алесь Смалянчук: "…. Мы з Алесем Краўцэвічам спачатку трапілі ў першы варыянт праграмы і, як я зразумеў зь сёньняшняй размовы з загадчыкам катэдры гісторыі Беларусі, адным з сустаршыняў аргкамітэту Іванам Крэнем, нас выкінулі з яе пад ціскам аддзелу ідэалёгіі гарвыканкаму. Узгадваюцца савецкія часы брэжнеўскага хіба пэрыяду, калі не гісторыкі вызначаюць, каму і што гаварыць, а вызначаюць (у той час камуністычныя чыноўнікі), чыноўнікі сучаснага палітычнага рэжыму. Гэта прыкра. Я адчуваю, што гістфак гарадзенскага унівэрсытэту, які мае пэўныя навуковыя традыцыі, усё больш ператвараецца ў нейкі дапаможны аддзел гарвыканкаму, які займаецца больш ідэалёгіяй, чым навукай. Гэтага нельга дапускаць, трэба пратэставаць, і я вельмі ўдзячны калегам, якія выказалі салідарнасьць […] знайшлі мужнасьць і сьмеласьць далучыцца да такога пратэсту".

Краўцэвіч: "Алесь Смалянчук зьяўляецца рэдактарам бюлетэню па гісторыі Горадні — "Горад Сьвятога Губэрта", у мяне ёсьць пара кніжак па гісторыі Горадні, я праводзіў археалягічныя раскопкі на тэрыторыі гораду. Несумненна здарэньне зьвязана з нашым удзелам у абароне гістарычнай Горадні. У прыватнасьці, мы падпісвалі заяву да генэральнага пракурора Беларусі пра варварскія разбурэньні культурнага слою ў цэнтры гораду, і была рэакцыя на гэта, было прадпісаньне зь Міністэрства культуры. Гэта зьвязана з нашай грамадзкай пазыцыяй, што мы адстойваем суб'ектную гісторыю Беларусі, якая не адпавядае афіцыйнай ідэалёгіі".

Гісторыкі адзначылі, што ўлады сёлета пачынаюць новы наступ на гістарычную забудову Горадні. Толькі яны вырашаюць, што зруйнаваць, а што пакінуць. Пазыцыя навукоўцаў і грамадзкасьці ігнаруецца.

**http://www.polskieradio.eu/zagranica/news/artykul79906.html**
**Ідэалягічны скандал у Горадні 09.04.2008**

Заўтра ў Горадні, у мурах Гарадзенскага ўнівэрсытэту, пачнецца двухдзённая канфэрэнцыя, прысьвечаная 880-ай гадавіне гораду.

Канфэрэнцыя яшчэ не адбылася, а ўжо стала прычынай палітычнага скандалу. Са сьпісу яе ўдзельнікаў былі выкрэсьленыя двое гісторыкаў: Алесь

Смалянчук і Алесь Краўцэвіч. У сувязі з гэтым некаторыя іх калегі праявілі салідарнасьць і адмовіліся ад удзелу ў мерапрыемстве.

Распавядае Павал Мажэйка, арганізатар імправізаванай прэс-канфэрэнцыі гісторыкаў, і сам па адукацыі гісторык.

П. Мажэйка: "Ужо 12 асобаў адмовілася ўдзельнічаць у канфэрэнцыі. І гэты сьпіс увесь час будзе павялічвацца, па меры таго, як інфармацыя будзе пашырацца. Ёсьць людзі, якія заявілі пра гэта адкрыта, называючы свае прозьвішчы, і ёсьць частка людзей, якія будуць «байкатаваць нагамі» - ня прыйдуць на канфэрэнцыю. Улады зробяць усё магчымае, каб яна адбылася, а гісторыкі падзеленыя на «чэсных» і «нячэсных», як калісьці журналісты. Улады спадзяваліся, што ўсё пройдзе ціха, што ўсе пойдуць на канфэрэнцыю, але чаша аказалася перапоўненай. Нават наражаючыся на магчымыя наступствы – звальненьні, вымовы, перасьлед – гісторыкі вырашылі, што значна важней захаваць свой гонар".

Прафэсійная салідарнасьць нячаста праяўляецца ў Беларусі. Часьцей людзі хаваюць свой гонар глыбока на дно душы й падпарадкоўваюцца загадам. Дадзены выпадак стаў выключэньнем. Алеся Смалянчука пазыцыя калегаў прыемна зьдзівіла.

А. Смалянчук: "Я не спадзяваўся такой рэакцыі калегаў. Лічыў, што нас выкрэсьлілі, але трэба, каб іншыя ішлі і выступалі. Зараз я думаю, што гэта добры крок. Мы дэманструем карпаратыўную салідарнасьць. У Беларусі з салідарнасьцю вялікія праблемы. Я разьлічваю, што пра гэта даведаюцца студэнты гістфаку. Яны дасюль не прымаюць актыўнага ўдзелу ў справах, якія тычацца гістарычнага цэнтру гораду. Ім забараняюць, і няма інфармацыі" [...]

Смаленчуку й Краўцэвічу былі пастаўленыя закіды наконт быццам бы палітызаванасьці іх дакладаў. Напрыклад, даклад Смалянчука датычыў Горадні на старонках «Нашай Нівы», цяпер апазыцыйнага выданьня, але дасьледаваньне тычылася ня нашых часоў, а пачатку XX стагодзьзя. Сапраўдная прычына - іх цьвёрдая пазыцыя ў абарону гораду падчас зьнішчальнай перабудовы.

А. Смалянчук: "Хутчэй за ўсё прычына зьвязаная з пазыцыяй у адстойваньні гістарычнага цэнтру Горадні як помніка архітэктуры. Мы пастаянна зьвяртаем увагу ўладаў, што парушаюцца законы пры правядзеньні рамонтна-будаўнічых працаў [...]

У размове зь гісторыкамі начальнік ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму Сяргей Дубавец заявіў, што нічога ня ведае пра матывы выключэньня гісторыкаў са сьпісу ўдзельнікаў. Але прадстаўнікі ўлады далі зразумець навукоўцам, што «такія гісторыкі, з такімі ведамі краіне непатрэбныя».

Натальля Грышкевіч

**Пра гэты байкот таксама паведамілі сайты газетаў "Наша Ніва" (http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=16337), "Пагоня" (http://pahonia.org/str/2008-04/183.htm) ды інш. Газета "Свабода" (2008 № 12) апублікавала артыкул Лізы Маняк пад назвай "Байкот ваяўнічаму невуцтву. "Нячэсныя" вучоныя супраць "чэсных" ідэолягаў".**

Падзея апынулася ў цэнтры ўвагі незалежных сродкаў масавай інфармацыі. І невыпадкова. Гарадзенскія чыноўнікі "ад ідэалогіі" (Дубавец, Сенчанкова) разам з "чэснымі" прарэктарамі ГрДУ імя Я.Купалы (А.Нечухрын, С.Агіявец) і гісторыкамі на пасадах з гістарычнага факультэту (І.Крэнь, Э.Ярмусік) упершыню ў гісторыі незалежнай Рэспублікі Беларусь адкрыта выкарысталі ідэалагічны (палітычны) крытэрый пры вызначэнні складу ўдзельнікаў навуковай канферэнцыі. Прынамсі, пра "навуковую канферэнцыю" ішла гаворка ў паведамленнях-запрашэннях кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ.

Безумоўна, гэта абуральны факт, які шмат гаворыць як пра сумленне і прафесійную годнасць названых асобаў, так і пра сітуацыю ў нашым горадзе. Чыноўная Горадня разам з афіцыйным Менскам сёння з'яўляюцца нефармальнымі лідэрамі ў справе знішчэння гарадской гісторыка-культурнай спадчыны і "зачысткі" гістарычнай навукі і адукацыі ад навукоўцаў, якія супрацьстаяць "экскаватарнай археалогіі" і гэтак званай "рэканструкцыі" гістарычных цэнтраў гэтых гарадоў. Між тым "злачынства" навукоўцаў толькі ў тым, што яны настойваюць на выкананні палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" і прывядзенні ўсіх рамонтна-будаўнічых прац у адпаведнасць з Генеральнымі планамі развіцця Горадні і Менску.

Варта яшчэ раз падкрэсліць, што "рэканструкцыя па-гарадзенску" – гэта фактычнае знішчэнне гісторыка-культурнай аўтэнтычнасці гораду і ператварэнне помнікаў гарадской архітэктуры або ў муляжы пад адкрытым небам, або ў пляцоўкі з бетону і пліткі. Менавіта гэта адбываецца зараз у гістарычным цэнтры нашага гораду на вачах ягоных жыхароў.

Аднак сёння нам пагражае страта гораду не толькі як помніка ўнікальнай архітэктуры... Рэканструкцыя па-гарадзенску – гэта адначасна спроба канчатковага знішчэння вольнага духу гораду, які, звычайна, адстойвала інтэлігенцыя, мясцовая інтэлектуальная эліта. Адпаведна праводзіцца палітыка запалохвання і пагрозаў. Асабліва цяжка тым, хто працуе ў дзяржаўных установах. Нават сумненні ў правамернасці дзеянняў мясцовых чыноўнікаў адразу ж трактуюцца як праява палітычнай апазіцыйнасці (!?) Вытокі гэтай варожасці знаходзяцца ў той савецкай эпосе, якую актыўна спрабуюць рэанімаваць сучасныя ідэолагі. У тыя часы чалавек, які дазваляў сабе думаць інакш, чым загадчык аддзела ідэалогіі Гарадзенскага абкама партыі або сакратар парткаму ГрДУ лічыўся амаль што ворагам дзяржавы.

Ва ўсведамленні сучасных мясцовых бюракратаў – горад з'яўляецца іх уласнасцю, і толькі яны могуць вызначаць лёс ягоных будынкаў і ягоных жыхароў. Менавіта таму ўсе спробы распачаць дыялог грамадскасці і чыноўнікаў закончыліся няўдачай. Патрабаванні гарадзенцаў або цалкам ігнаруюцца, або адбываецца імітацыя дыялогу. Менавіта так можна ахарактарызаваць правядзенне на гістарычным факультэце ГрДУ ў чэрвені 2007 г. "круглага стала" па пытаннях аховы спадчыны Горадні. Ён адбыўся за зачыненымі дзвярыма пад аховай БРСМ і міліцыі (гл. выпуск трэці "Гораду святога Губерта").

Наогул, адміністрацыя ГрДУ і большасць выкладчыкаў гістарычнага факультэту выступаюць фактычнымі пасобнікамі разбурэння гістарычнага цэнтру. Адныя (А.Нечухрын, С.Агіевец, І.Крэнь, Т.Бадзюкова, Э.Ярмусік, С.Сяльверстава, У.Амелька, В.Белазаровіч) адкрыта падтрымліваюць усе "рэканструкцыйныя" дзеянні Саўчанкі, Анісімава і Антоненкі. Большасць шараговых выкладчыкаў робіць тое ж самае моўчкі, дэманструючы поўную абыякавасць да лёсу гістарычнай Горадні. Гэтыя былыя калегі даўно страцілі ўсялякае маральнае права выкладаць гісторыю і працаваць з моладдзю.

Мяркую, што сучасны прафесійны і маральны крызіс гістфаку ГрДУ ў вялікай ступені з'яўляецца вынікам працяглага кіравання факультэтам і кафедрай гісторыі Беларусі прафесарам Іванам Крэнем. Кіраванне ў стылі сакратара парткому, адсутнасць элементарнага ўяўлення пра сутнасць гістарычнай навукі, успрыняцце яе як выключна ідэалагічнага кампанента дзяржаўнай палітыкі (незалежна ад таго С.Шушкевіч ці А.Лукашэнка кіруюць дзяржавай) былі характэрнымі рысамі жыцця гістфаку і кафедры гісторыі Беларусі на працягу амаль 20 гадоў. Вынікі перад вачыма…

Яны, напрыклад, у з'яўленні "навуковых" выданняў накшталт кнігі дацэнта кафедры гісторыі Беларусі Уладзіміра Ягорычава, прысвечанай "харчовай палітыцы" савецкай улады ў Беларусі ў 1917-1920 гг. (Гродно: ГрДУ, 2007) Па ўзроўню "навуковасці" і стылі напісання – гэта тыповае савецкае выданне канца 70-х – пачатку 80-х гг., у якім дамінуе тое разуменне гістарычнай навукі, якое было характэрным для гістарычнага факультэту Гарадзенскага педінстытуту эпохі брэжнеўскай БССР. Гэтыя ж вынікі праяўляюцца ў імкненне цалкам ізаляваць студэнтаў гістфаку ад навуковага і грамадска-культурнага жыцця па-за межамі універсітэту. Гістфак паспяхова прадукуе шэрагі малаадукаваных спецыялістаў з дыпломам гісторыкаў і сацыёлагаў, няздольных самастойна і незалежна мысліць. Шматлікія сустрэчы з выпускнікамі гістарычнага

факультэту апошніх дзесяцігоддзяў пакінулі сумнае ўражанне. Гэта сапраўдная трагедыя для культуры рэгіёну, што большасць выпускнікоў-гісторыкаў абсалютна перакананыя, што ведаюць УСЁ і здольныя напісаць навуковую працу (нават дысертацыю) на КОЖНУЮ тэму.

Сёння годнасць гарадзенскіх гісторыкаў абараняюць пераважна тыя навукоўцы, якім пашчасціла не працаваць на гістарычным факультэце. Менавіта іх паводзіны ў красавіку 2008 г. паказалі, што горад усё ж такі мае сваю інтэлектуальную эліту.

Звесткі пра "ідэалагічны" адбор удзельнікаў канферэнцыі ўскалыхнулі навуковую супольнасць краіны. Адным з першых ідэю байкоту выказаў вядомы гісторык Генадзь Сагановіч. Яе падхапілі іншыя даследчыкі з Менску, Горадні, Берасця, Гомеля, Беластоку і Кракава. Паводле неафіцыйных ацэнак, якія цыркулявалі сярод арганізатараў канферэнцыі, з прычыны байкоту ў ёй не прынялі ўдзелу каля 40 навукоўцаў (!) Не ўсе публічна дэкларавалі ўласны ўдзел у байкоце. З розных прычынаў многія байкатавалі гарадзенскую канферэнцыю "нагамі". Асаблівую мужнасць праявілі тыя гарадзенскія даследчыкі, якія не пабаяліся адкрыта асудзіць ідэалагічную цэнзуру і тое пагардлівае стаўленне да гістарычнай навукі, якое прадэманстравалі галоўныя арганізатары канферэнцыі. Не будзе перабольшваннем сцвярджэнне, што дзеянні чыноўнікаў і адміністрацыі факультэту абярнуліся поўным навуковым правалам канферэнцыі. Прычым некаторыя з байкатуючых заявілі, што наогул адмаўляюцца ўдзельнічаць у "навуковых" мерапрыемствах гістарычнага факультэту ГрДУ. Шэраг удзельнікаў канферэнцыі пазней адмовіліся аддаць тэксты сваіх дакладаў для публікацыі ў зборнік матэрыялаў гэтай канферэнцыі.

Значэнне гэтага байкоту выходзіць таксама за межы гістарычнай навукі. Між іншым яно сведчыць пра тое, што нягледзячы на ўсе запалохванні з боку гарадзенскай бюракратыі, а таксама шматлікіх чыноўнікаў ГрДУ "ад навукі", у нашым горадзе ўсё ж такі сфармавалася грамадзянская супольнасць, якая разумее, што абарона гістарычнага цэнтру ад "экскаватарнай рэканструкцыі" – гэта абарона лепшых гістарычных традыцый нашага горада, абарона таго духу свабоду і незалежнасці, які адлюстраваўся яшчэ ў гербе Горадні часоў Магдэбургскага права.

Менавіта сярод прадстаўнікоў гэтай супольнасці нарадзілася ідэя правесці ў нашым горадзе навуковую канферэнцыю, на якой з сваімі рэфератамі маглі б выступіць удзельнікі байкоту. І не толькі яны. На гэтую канферэнцыю былі запрошаныя іншыя навукоўцы,

а таксама выкладчыкі гістарычнага факультэту. Рэфераты плануецца выдаць да правядзення навуковай сустрэчы, каб забяспечыць актыўнае абмеркаванне актуальных праблемаў як мінулага, так і сённяшняга дня Горадні. Галоўным крытэрыям адбору тэкстаў для публікацыі будзе іх высокая навуковая вартасць. Гэта ж будзе падставай для запрашэння іх аўтараў на навуковую канферэнцыю.

P.S. Яшчэ больш мярзотным выглядала ўмяшальніцтва чыноўнікаў гарвыканкаму ў правядзенне гарадской школьнай канферэнцыі, прысвечанай юбілею горада. Менавіта па іх загаду з праграмы канферэнцыі выкінулі прозвішчы вучняў, якія прымалі ўдзел у абароне гістарычнага цэнтру. Вось якая інфармацыя з'явілася ў тыя дні на сайце http://harodnia.com/a135.php

**Гродзенскі гарвыканкам забараніў школьнікам удзельнічаць у канферэнцыі**

30 красавіка 2008 года

Па загаду гарвыканкама з праграмы гарадской школьнай канферэнцыі выкінуты прозвішчы вучняў, якія прымалі ўдзел у абароне цэнтра Гродна.

Яшчэ не заціхла водгулле забароны ўдзелу ў гарадской юбілейнай навуковай канферэнцыі двум дактарам гістарычных навук, вядомым беларускім гісторыкам А. Смаленчуку і А. Краўцэвічу, а гарадскія ўлады ўжо спрабуюць пераўтварыць успадабаны імі метад барацьбы з гісторыяй у традыцыю. На гэты раз забарона кранулася не масцітых гісторыкаў, а ... дзяцей – вучняў гродзенскай сярэдняй школы № 28.

Амаль год таму некалькі таленавітых дзесяцікласнікаў, вучняў гэтай школы, знялі фільм, прысвечаны так званай "рэканструкцыі" Гродна. Наіўныя маладзёны арганізавалі прэзентацыю гэтага фільма ў роднай навучальнай установе. У выніку, пасля таго, як гэты факт стаў вядомы мэру горада А. Антоненку, сваімі працоўнымі месцамі ледзь не паплаціліся загадчык гарадскога управлення адукацыі С. Блажэй, дырэктар школы М. Ахметаў і настаўнік школьнікаў, загадчык школьнага музея І. Рабкоў. Бацькоў школьнікаў (а некаторыя з іх займаюць даволі значныя пасады ў пагранічнай службе і КДБ) папярэдзілі па службовай лініі.

Здаецца, канфлікт быў вычарпаны, аднак няма межаў подласці і злапомнасці. 22 красавіка 2008 г. у ліцэі № 1 г. Гродна мелася адбыцца 10-я юбілейная канферэнцыя "Миры моего Я". Мэр горада патэлефанаваў дырэктару СШ № 28 Ахметаву і загадаў забараніць удзел у канферэнцыі І. Рабкову і яго вучням А. Батуру і М. Латомскаму. Дырэктар ліцэя № 1 А.Панцэвіч хуценька перарабіў праграму канферэнцыі, выкінуўшы адтуль імёны згаданых вучняў.

…Адзін з добрых знаёмых Міхаіла Булгакава прыгадаў, як вядомы пісьменнік запытаў яго: "Якая самая вялікая чалавечая загана?" І сам жа адказаў: "Баязлівасць. Яна нараджае ўсе астатнія…"

# Як спыніць чыноўніка з сякерай?..

Асобнай старонкай "рэканструкцыі па-гарадзенскі" стала масавая вырубка дрэваў. Усё пачалося з знішчэння прыгожых і здаровых дрэваў на Савецкай плошчы летам 2006 г. Некаторым падалося гэта трагічнай памылкай або непазбежнасцю, звязанай з будаўнічымі працамі, але наступныя падзеі паказалі, што існуе нешта падобнае на распрацаваны план вынішчэння традыцыйных для горада дрэваў. Іншым разам падаецца, што немагчыма рацыянальна растлумачыць гарадскую палітыку адносна зялёных насаджэнняў. Прынамсі, відавочна, што сёння ў фаворы каменная плітка...

Пытанне, як спыніць чыноўніка з сякерай, пакуль застаецца без адказу...

Як, зрэшты, і тыя пытанні, якія ўжо ставіліся гарадзенскімі журналістамі. Хочацца іх нагадаць:

- Колькі бюджэтных сродкаў было выдзелена на масавую вырубку здаровых дрэваў у горадзе?
- Якія фірмы ажыццяўляюць масавыя закупкі і пастаўкі імпартных саджанцаў для азелянення?
- Чаму загады пра вырубку ў парушэнне Генплана і праекта рэканструкцыі Савецкай плошчы аддаваў асабіста старшыня аблвыканкаму Уладзімір Саўчанка?

**Ігар Лапеха** падрыхтаваў спіс знішчаных за апошнія тры гады дрэваў у горадзе. Прапануем вашай увазе гэты спіс, цікавыя аўтарскія разважанні наконт палітыкі азелянення ў нашым горадзе і ўнікальны інвентар старых дрэваў Горадні.

Рэдакцыя

## Спіс знішчаных дрэваў у Горадні ў 2006-2008 гг.

– ліпы 1930-х гг. на беразе Нёмана каля былога Рачнога вакзала,

– двухсотгадовы ясень у двары дома на скрыжаванні вул. 1-га мая і вул. Валковіча (гэта абуральны факт!),

– агаленне схілаў Старога Замка, Новага Замка, касцёла бернардынцаў, школы-ліцэя № 1, занёманскай сінагогі (цяпер эрозія



**Успамін пра плошчу... 2005 г.**

схілаў будзе забяспечваць безперабойнасць працаў па ўмацаванню схілаў для брыгады Зяленгаса),

– дрэвы ў скверах на Савецкай плошчы,

– дрэвы ў парку імя Жылібера (пракладка бетонных дарожак, знішчэнне старога дзёрну з паверхневай карнявой сістэмай дрэваў, змяненне гідралагічнага рэжыму пры будаўніцтве сажалак на Гараднічанцы прывялі да массавага засыхання ясеняў),

– дрэвы па вул. Горкага,

– дрэвы ў раёне стадыёну і паліклінікі МУС,

– дрэвы па вул. Савецкай,

– тапалёвыя алеі па ўсяму гораду (даўно даказана, што алергію выклікае пыльца, а не буйнасегментавы пух таполяў. Да таго ж садзіць можна мужчынскія асобіны. Але пілаваць прасцей, чым выбіраць і думаць),

– дрэвы ў заапарку (Замежныя турысты ўжо збіраліся падаваць скаргу ў міжнародныя структуры за здзек над жывёламі: бетон, стальныя краты і ніводнага дрэўца),

– дрэвы на старых могілках (на праваслаўных не засталося ніводнага дрэўца, адзінкі засталіся на каталіцкіх),

– дрэвы па вул. Савецкіх пагранічнікаў (знішчаны каштанавыя прысады савецкага часу пры пашырэнні вуліц, у выніку замест двух

рознаўзроўневых развязак на Паповіча – Савецкіх пагранічнікаў і Гарнавых – Савецкіх пагранічнікаў мы маем яшчэ дзве “Лысыя гары”).

І гэта яшчэ не ўсё. Колькі загінула дрэваў паадзінкава ў дварах?! Колькі пазасыхала ў выніку ўкладкі плітак?! За красавік 2008 г. на вачах у аўтара былі спілаваныя алея з акацый каля чыгуначнага вакзала, дзве ліпы на былых лютэранскіх могілках, дзве ліпы на тэрыторыі бальніцы № 1, у т.л. і “ліпавы куст” з пяці ствалоў.

Каму ж так шкодзяць дрэвы? Хто пагражае зялёным рызам нашага горада?

Па-першае, новае будаўніцтва. На жаль, аўтары праектаў новых пабудоў у горадзе зусім не лічаць за каштоўнасць і цалкам не бяруць у разлік існуючыя зяленыя насаджэнні. Рэльеф – так! Архітэктурнае атачэнне – так! А дрэвы – ні пры якім раскладзе!

Такі падыход не дапушчальны! Яркім прыкладам адваротнага з’яўляецца будаўніцтва дома на вул. Захарава. Будаўнікі спрабуюць захаваць дзве стогадовыя ліпы, якія надалей стануць вельмі прывабным дэкарацыйным аздабленнем элітнага дома. Праўда, катлаван пад падмурак можна было б вырыць менш размашысты і засыпаць лішку паміж дрэвам і падмуркамі хутчэй (ліпам не хапае вільгаці, вада проста сплывае ў яму), ды і пару можна было б для будаўніцтва выбраць зімовую, калі вегетацыя дрэваў замаруджана. Але абвінвачваць у гэтым будаўнікоў не варта. Ім проста ніхто на гэтыя праблемы не указаў, ніхто не навучыў пэўным тэхналагічным прыёмам, не вызначыў прыярытэты.

Самай фундаментальнай пагрозай з’яўляецца працэс пашырэння вуліц і стварэнне новых паркавачных месцаў. На першы погляд здаецца аб’ектыўным працэсам, што кожны аўтамабіль забірае па 10 м² газона. Але на самой справе можна палепшыць сітуацыю і без вырубкі дрэваў. Па-першае, трэба адмовіцца ад прыярытэтнасці чалавека з машынай. Насамрэч, “наши люди в булочную на автомобиле не ездят”. Аўтамабіль не павінен пад’язджаць да кожнай параднай (каля дома павінны гуляць дзеці, расці кветкі). Аўтамабілю не месца ў гістарычным цэнтры і месцах адпачынку: парках, лесе, па берагах рэк і азёр. Калі хапіла грошай на машыну і дарагое паліва, то павінна хапіць на платнае паркавачнае месца ў шмат'ярусным гаражы!

Хтосці палічыць апошнія радкі агрэсіўнымі. Агрэсія сапраўды наспела і ўжо выліваецца дробнымі бунтамі то пад бокам Універсама на БЛК, то каля бензазаправак на вул. Пушкіна і Чайкінай, то ў старых дварах, дзе бабулькі засланяюць сабой дрэвы ад вырубкі

пад пашырэнне аўтастаянкі. А ўсё з-за таго, што гарадзенскія ўлады праводзяць бяздарную камунальную палітыку.

Што трэба рабіць уладам, каб прывесці да нейкай нормы цяперашнюю сітуацыю? Тэрмінова заняцца будаўніцтвам сеткі шматпавярховых парковак, у спальных раёнах і па перыметру вакол гістарычнага цэнтра. Гэта дорага, і далёка не кожны аўтаўладальнік зможа аплаціць месца, але існуе сістэма банкаўскіх крэдытаў, існуе добрая воля ўладаў у бюджэтным датаванні падобных праектаў (асабіста як падаткаплацельшчык з задавальненнем бы перанакіраваў сродкі, выдзеленыя на пераабліцоўку плошчы Леніна, на будаўніцтва падобнага гаража).

Другая прычына змяншэння зяленых насаджэнняў – гэта нерацыянальная, “часовая” арганізацыя транспартнага руху і будаўніцтва дарог і развязак. Улады займаюцца развіццём не тых накірункаў! Пабудавалі б яны своечасова праезд паміж Новым мастом і бальніцай хуткай дапамогі – і не прыйшлося б так бязмерна пашыраць скрыжаванне вул. Паповіча – Савецкіх пагранічнікаў. Злучылі б яны ў свой час БЛК і вул. Брыкеля, а таксама дзве палавінкі вул. Курчатава і не прыйшлося б пашыраць вул. Горкага і Дзяржынскага, пакідаючы транзітныя плыні праз гістарычны цэнтр. Дабудавалі б своечасова вул. Астроўскага (эстакада праз чыгунку – псіхіятрычная бальніца), і Стары мост застаўся б старым…

Увогуле, дзіву даешся, як улады эканомяць на неабходным і “бухаюць” сродкі на часовыя праекты. Эканомяць на эстакадных развязках і выкідваюць грошы на асфальтаванне гектараў каштоўнай гарадской тэрыторыі. У парушэнне ўсіх архітэктурных і эстэтычных законаў пілуюць дрэвы, зносяць дамы, перасяляюць людзей, а тых, хто застаўся, пазбаўляюць утульнасці, цішыні, чыстага паветра… Хоць па ўсіх дэталёвых распрацоўках Генплана горада скрыжаванні вул. Паповіча – Савецкіх пагранічнікаў, вул. Гарнавых – Савецкіх пагранічнікаў, вул. Белуша - Кляцкова павінны быць з эстакадамі.

У палітыцы мясцовых уладаў у галіне развіцця транспартнай сістэмы хацелася б бачыць яшчэ два пункты: імкненне да вынаса з Гістарычнага цэнтра жылых мікрараёнаў у прамысловыя зоны і вывядзення з гораду ўсёй транспартнай інфраструктуры (бензазаправак па вуліцах Падольнай, Краснаармейскай, Пушкіна, Чайкінай; рамонтных майстэрняў, прыватных гаражоў). Хацелася б бачыць імкненне уладаў пасадзіць як мага больш прысадаў уздоўж вуліцаў, палісаднікаў у дварах і садзіць 20-цігадовыя дрэвы а не дубцы.

Самая адыёзная і злачынная пагроза “зяленым лёгкім” нашага горада гэта дзеянні гэтак званага “казённага добраўпарадкавання”. Адразу кідаецца ў вочы непрыкрытае жаданне вытворцаў тратуарнай пліткі рэалізаваць як мага больш сваёй прадукцыі, а будаўнікоў – зрабіць укладку аб’емнай і працаёмкай са складанай канфігурацыяй. У выніку ў парку пліткі больш, чым травы, а дрэвы шчыльна акружаны пліткавымі ціскамі. Улада непасрэдна зацікаўлена ў рэалізацыі аб’ёмаў пліткі і не выконвае кантралюючых функцый заказчыка.

Другая пагроза – кашэнне газонаў. Косіцца ўсё, у тым ліку неукараніўшаяся трава. Пасля гэтага на схілах пачынаецца эрозія глебы. Цяжка зразумець мэтазгоднасць тых фітадызайнерскіх патуг, якія прадпрымаюцца ў Горадні.

Тым хто гэтым займаецца хочацца даць некалькі парадаў. Перад тым, як планаваць, нанясіце на свае планы-схемы ўсе дрэвы з плошчай кроны, зрабіце нормай, што плошча пад кронай павінна быць пакрытая газонам), на кожным малюнку дрэва напішыце кошт, які складаецца з двух лічбаў: штрафа, які плоціцца за спілоўванне падобнага дрэва ў Германіі, і кошта высадкі новага дрэва. Пасля таго, як вы абдумалі ўсе мажлівыя варыянты і ўсё ж такі запраектавалі вырубку і новыя пасадкі звярніцеся да прафесіянальнага ландшафтнага дызайнера (пажадана з Мінска альбо нават з-за мяжы), каб той узбагаціў ваш газон рознаяруснымі кампазіцыямі: дрэвы-кусты-кветкі. І галоўнае не забывайцеся раіцца з грамадскасцю. Будзе прапанавана мноства варыянтаў і будзе з чаго выбіраць.

Каб дасягнуць максімальнага эмацыянальна-эстэтычнага эфекта ад закладкі альбо рамонта зялёных насаджэнняў існуюць пэўныя правілы.

Штучныя насаджэнні з большага дзеляцца на две групы: рэгулярныя і пейзажныя. Больш пафасны рэгулярны стыль (роўныя алеі шматлікіх, але стромкіх дрэваў, агароджы са стрыжаных кустоў, аднастайныя геаметрычныя клумбы) якраз падыходзіць для ўжытку на шырокіх прамых гарадскіх магістралях, шырокіх пляцоўках парадных плошчаў. Пейзажны стыль – больш тонкі. Тут вельмі важна не “перабаршчыць з ванільлю”. Ён ужываецца для афармлення прыроднага нязвыклага рэльефа альбо камернай зоны адпачынка (паляна, дворык). У нас наадварот “японскія садзікі”, “альпійскія горкі”, рознафактурныя пасадкі экзатычных дрэваў, аздобленыя “рюшэчкамі” бясконцых загародак, ліхтарыкаў, каляровай пліткі з падворкаў катэджаў “новых рускіх” вырваліся на вуліцы і плошчы горада.

Няўжо сучасныя праектанты не разумеюць што помнік загінуўшым жалнерам у парку ў атачэнні піхтачак і туечак выглядае зусім недарэчна?! Няўжо не бачна што дэндрарыі ў скверы на Савецкай плошчы без шчыльнай курціны з алеі старых ліп, на фоне труб, аўтамабіляў, і танка выглядаюць таксама як недарэчнасць?! Не бачаць, і працягваюць рубіць, бетаніраваць... і сярод бетону ўстаўляць "японскія садзікі"?!

Відавы выбар культур на азеляненне фарміруецца зараз досыць тэндэнцыйна. Ён не адрозніваецца вялікай разнастайнасцю і досыць дарагі для падаткаплацельшчыкаў. Канешне, можна распачаць культываваць ў Горадні магноліі і платаны (клімат ўжо дазваляе), але ці пацягнем мы гэта фінансава. Мне здаецца, прышчэпленыя формы вязаў, вербаў, клёнаў не будуць таннейшымі за платаны.

Камусці гэтыя "мутанты" падабаюцца, камусці не падабаюцца, рэч не ў тым. Як доўга яны б не раслі, усё роўна застануцца нізкарослымі. Як японскае дрэва-бансай патрабуе памяшкання, так нашыя "мутанты" патрабуюць закрытай прасторы дворыка. Нельга іх высаджваць у Каложскім парку, над засыпанай Гараднічанкай каля гарвыканкаму ці на Савецкай плошчы. Нізкарослыя функцыі другога яруса заўсёды выконвалі кустарнікі, больш разнастайныя па відах і нашмат таннейшыя.

Куды падзеўся з гарадскіх сквераў усімі каханы бэз (дзякуй цётачкам, якія не забываюць яго ў сваіх палісадніках, а то б радасці ад мая не было б)? Дзе традыцыйна нашыя каліна, гарэшнік, барбарыс, акацыя жоўтая (так папулярная ў 70-я гг. XX ст), парэчка, шыпшына, язмін садовы, чаромха, ядловец звычайны, ядловец віргінскі, туя заходняя? Дзе нашыя нізкарослыя дрэвы рабіна (красуня ва ўсе поры году), глог, яблыня. Даўно на Беларусі культывуюцца будлея зменная, вішня кітайская, бружмель татарскі, ірга канадская, кізільнік бліскучы, айва, спірэя вангута? Дзе яны ў планах сучасных азяляніцеляў Горадні?

Але вернемся на верхні ярус азялянення, які з'яўляецца асновай зялёнай кампазіцыі, дае цень спрагнёным, радасць стомленым. Базавыя пароды дрэваў можна для зручнасці збольшага падзяліць на две групы. Першая (акацыя белая, бяроза барадаўкавая, вярба, таполя, чаромха маака, лох вузкалісны, гарэх манжурскі) – хутка растуць, хутка старэюць, добра прыжываюцца, досыць вынослівыя да выхлапных газаў і бетоннаму ціску, ломкія на вятру.

Другая (хвоя звычайная, хвоя веймутава, елка звычайная, канадская, дуб, конскі каштан, клён, ліпа, граб, ясень) – марудна

растуць, але жывуць доўга і стойкія да ветру, у маладосці патрабуюць прасторы, добрай глебы і чыстага паветра.

Прыходзіцца канстатаваць поўную адсутнасць рацыянальнай палітыкі азелянення горада. Тое, што дзесяцігоддзямі вырошчвалі папярэднія пакаленні бязлітасна нішчыцца, а нічога вартага ўвагі будучых пакаленняў не высаджваецца. Быццам бы апраўданыя вырубкі (прарэджванне, санітарныя вырубкі, пагроза завала старых дрэваў, зацямненне вокнаў) ператвараюцца ў татальнае знішчэнне зялёных насаджэнняў па ўсяму гораду. **Горадня ператвараецца ў пустыню.**

## Інвентар дрэваў Горадні, старэйшых за 70 год

па стану на 1 мая 2008 г.[1]

Для зручнасці прагляду спіс групіруецца па наступных раздзелах:

I. Цэнтр (Нёман – Гараднічанка – Прывакзальная плошча – чыгунка – Нёман).

Узбярэжная Ядкоўскага – 6 ліп, 3 клёна, 1 ясень.
Вакол колішняй “Фары Вітаўта” – 6 каштанаў, 2 ліпы, 2 клёна.
Вул. Замкавая – 4 ліпы, 1 ясень.
Стары замак – 9 ліп, 12 клёнаў.
Новы замак – 16 ліп, 12 акацый, 2 дуба.
Бернардынская гара – 3 клёна, 2 ясеня, 1 ліпа, 1 каштан.
Вакол школы-ліцэя № 1 – 2 дубы, 6 ліп, 3 клёны, 1 ясень.
Вул. Парыжскай камуны – 23 ліпы, 5 клёнаў, 1 каштан, 1 дуб, 69 грабаў.
Вул. Свердлава – 5 ліп, 5 каштанаў, 1 ясень.
Тэлеграфны завулак – 5 ліп, 27 грабаў.
Вул. Тэлеграфная – 1 ясень.
Брыгіцкі сад – 3 ліпы, 1 дуб.
Паміж вул. Маркса і Кірава – 2 ясені, 2 ліпы.
Вул. Паўлоўскага – 2 ясені.
Вул. Сацыялістычная № 28а – 2 дуба, № 44 – 2 ліпы.
Каля кінатэатра “Гродна” – 1 ліпа, 1 ясень.

---

[1] У спіс не ўключаны тэрыторыі лесапаркаў Пышкі (Нёман – Болдзіна – Дамброўскага – ручай – Нёман) і Румлёва (Нёман – чыгунка – Купалы – Фамічова – Нёман), а таксама хваёвыя пралескі каля бальніцы № 4 і завулка Перамогі. Інвентар не ўлічвае колькасці даваенных таполяў, бяроз, хвоі, елкі, вярбы, вольхі, пладовых дрэваў, клёна, ясеня лістнага з-за іх хуткага старэння ў гарадскіх умовах (80 год для гэтых дрэваў – гэта глыбовая старасць). У спіс не ўвайшлі таксама новыя тэрыторыі горада, далучаныя ў 2008 г. Таксама варта заўважыць, што прамежак паміж даваеннымі і паваеннымі пасадкамі каля 20 год, таму дрэвы савецкага часу ад старэйшых прыкметна адрозніваюцца па знешняму выгляду.

За “Дамініканскай школай” – 7 ліп.
Вул. Кастрычніцкая № 3 – 1 ліпа.
Вул. Траецкая № 37 – 1 дуб.
Сквер на вул. Тэльмана – 3 ліпы.
Вул. Студэнцкая – 2 ясені, 1 ліпа.
Вул. Леніна № 28 – 1 ліпа, 2 ясені.
Вул. Будзёнага – 4 ліпы, 1 клён, № 48а – 2 вязы, 1 ясень.
ТЭЦ № 1 – 1 дуб, 1 ліпа.

ІІ. “Гарадніца” (Гараднічанка – Прывакзальная плошча – 1 Мая – вектар на вул. Лермантава – завулак Віленскі – Гараднічанка).
Вул. Акадэмічная і 1 Мая – 29 ліп, 14 ясеняў, 1 дуб.
Вул. Валковіча – 8 ліп, 5 ясеняў; вакол дзіцячага садзіка – 6 ліп, 2 ясені.
Стары парк – 103 ясені, 24 ліп, 6 каштанаў, 1 таполя, 4 клёны, 2 дубы.
Вакол Архірэйскага падворка – 52 дрэвы.
Гараднічанка за домам Э.Ажэшкі – 1 каштан, 15 ясеняў, 3 ліпы, 2 клёна.
Пакроўскі сабор – 21 ліпа.
Дом-музей Гарадніцы – 2 ліпы.
Кавярня “Стары млын” – 1 ліпа.

ІІІ. “Новы свет” (Нёман – “літоўскі ручай” – вул. Скрынніка, Катоўскага, Даватара, Церашковай – чыгунка – Прывакзальная плошча – Першага Мая – вектар на Лермантава – завулак Віленскі – Гараднічанка – Нёман).

Вул. Горкага каля “Космаса” – 17 ліп, 2 акацыі, 1 дуб, дом № 13 – 1 ліпа, № 5 – 1 ліпа.
Вул. Астроўскага каля дамоў №№ 2-4 у бок вул. Славацкага – 13 ліп, 1 акацыя, 1 лістоўніца; № 15 – 4 ліпы, 2 ясені.
Вул. Рэйманта каля дамоў №№ 15-39 і ў двары бальніцы – 21 ліпа (алеі на тэрыторыі бальніцы пагражае вырубка), 4 іншыя дрэвы; № 10 – 1 ліпа.
Вул. Пушкіна (старая частка) – 22 ясені, 1 ліпа.
Вул. 17 верасня (ад вул. Горкага да вул. Пушкіна) – 17 клёнаў платаналістных (алея з сфармаванай кронай), 3 ліпы, 3 іншыя дрэвы.
Вул. Бялінскага – 7 ліп, 6 ясеняў.
Вул. Міцкевіча – 21 ліпа, 9 акацый, 3 туі, № 13а – туевы куст з елкай.
Вул. Дзяржынскага (каля шпіталя) – 16 ліп, 1 дуб, 1 груша; на скрыжаванні з вул. Церашковай – 2 ліпы.
“Юрыздыка” (даліна паміж вул. 17 верасня і СШ № 10) – 15 ліп, 6 кленаў, 12 ясеняў, 1 каштан, 1 ліпа.
Вул. Багдановіча – 3 ліпы, 3 іншыя дрэвы.
Прысады каля СШ № 4 – 22 ясені, 5 ліп.
Вакол бальніцы № 1 – 7 ліп.
Вул. Мядовая – 3 ліпы, 2 елкі, 1 груша.
Вул. Горкага, дом № 34 – 2 ліпы, 1 каштан (абрысы вул. Друскеніцкай).
Вул. Каліноўскага, дом № 7 – 2 ліпы (абрысы вул. Пажарскага).

Вул. Серафімовіча, дом № 2 – 1 ліпа.
Вул. Камунальная, дом № 32 – 30 ліп.
Каложскі парк, на тэрасе каля Каложы – 19 ліп, 1 клён; на верхняй тэрасе – 2 клёна, 2 ліпы.
Вакол Палаца дзіцячай творчасці – 32 клёны, 11 ліп, 3 ясеня, 1 груша.
Станіславоўскі ансамбль захаваў толькі 130 даваенных дрэваў.
Пераезд праз чыгунку каля вакзала – 2 каштаны.

IV. Фарты – Дзевятоўка.
Вул. Горкага каля “Рамантыкі” – 4 ясені.
Вул. Харужай, дом № 15 – 1 лістоўніца, дом № 6 – 3 ліпы.
Вул. Каліноўскага, дом № 59 – 2 грушы.
Пр. Будаўнікоў, дом № 17а – 1 ліпа, 3 клёны.
БЛК, дом № 42а – 4 ліпы.
Кавярня “Золотой Теленок” – 2 ліпы.
Могілкі на Другім завулку Дзяржынскага – 3 дубы, 1 бярозы.
Каля палікλінікі № 6 – 1 ліпа.
Вул. Брыкеля – 1 ліпа.
Скрыжаванне вул. Дзяржынскага і Церашковай – 2 ліпы.

V. “Пагулянка” – прадпрыемства “Азот” (правабярэжная частка Кастрычніцкага раёна).
Вул. Шчорса – 4 ясені, 4 акацыі, 3 клёны, каштан.
Вул. Пралетарская – 5 ліп.
СШ № 13 – 4 акацыі.
Вайсковы гарадок – 3 ліпы.
Пр. Касманаўтаў, дом № 8б – 4 ліпы, 1 клён, 1 каштан; дом № 6б – 1 дуб., з боку вул. Захарава – 2 ліпы.
СШ № 11 – 6 ясеняў.
Вайсковыя могілкі – 85 ліп, 11 ясеняў, 6 клёнаў, 3 каштана.
Вайсковая частка – 2 ліпы.
Каталіцкія могілкі – 3 ліпы, 16 клёнаў, 5 ясеняў, 5 таполяў.
Праваслаўныя могілкі – на схіле 2 клёны, праз дарогу 2 ліпы, каля увахода 1 каштан.
Аўтавакзал – 2 ясені.
ДАІ праз вул. Кляцкова – 2 ліпы.

VI. Фарты – агароды (левабярэжняя частка Кастрычніцкага раёна на захад ад чыгункі).
Вул. Дарвіна, дом № 14 – 1 вяз.
Фабрыка лёдаў – 2 ліпы.
Пякарня – 5 ліп.
Вул. Савецкіх пагранічнікаў, дом № 33 – 2 ліпы, 2 клёны, 1 каштан, 1 лістоўніца; дом № 56 – 4 ліпы, 1 клён, дом № 55 – 1 ліпа, дом № 69 – 1 ліпа, № 73 – 1 ліпа, дом № 88 – 1 ліпа; выцьвярэзнік – 5 ліп,

СШ № 6 – 13 ліп, 3 грабы.
Вакол Тытунёвай фабрыкі – 16 ліп.
Вул. Скосная, дом № 1 – 1 ліпа, № 18 – 1 ясень.
Вул. Аб'яздная – 8 ліп.
Вакол храма на вул. Лялевеля – 20 ліп.
Вул. Лялевеля, дом № 24 – 8 ліп, дом № 34 – 1 ліпа.
Вул. Кутузава, дом № 26 – 7 ліп, 2 клёны.
Вул. Бертэля, дом № 5 – 1 ліпа.
Вул. Шасейная, дом № 12 – 1 ліпа.
Зав. Калектыўны, дом № 26 – 3 ліпы, 1 клён.
Вул. Рылеева, дом № 12 – 5 ліп.
Вул. Рэпіна: каля СШ № 20 – 4 ліпы, каля Капліцы – 7 ліп, 1 дуб, 1 клён (на вуліцы) – 4 ліпы, 2 клёны, 3 каштана з апрацаванай кронай (шынамантаж) – 1 ліпа, грабавы гай.
Садзік № 65 і клуб "Пунцовыя ветразі" – 10 ліп, 3 клёны, 3 таполі.
Каля высакавольтнай апоры – 2 грабавыя кусты.
Вайсковая частка "Фолюш" – 48 ліп, 3 клёны, 1 лістоўніца.

VII. "Палестына" – Вішнявец (левабярэжняя частка Кастрычніцкага раёна, на ўсход ад чыгункі).
Тэрыторыя паміж вул. Гая і вул. Купалы – 82 ліпы, 34 клёны, 21 граб, 32 акацыі, 2 вязы.
Зправа і злева па берагу ад вул. Збожжавай, дом № 67 – 7 ліп, 4 клёны, 1 дуб, 1 ясень.
Могілкі на вул. Перамогі – 23 ліпы, таполі.
Крама "Сонечная" – 12 таполяў, прысады старой дарогі.

# Юбілей гісторыка

Гісторык і археолаг Алесь Краўцэвіч сёлета адзначыў паважны юбілей. За плячыма вялікі навуковы даробак, таленавітая публіцыстыка, актыўная грамадская дзейнасць.

Навуковец нарадзіўся ў вёсцы Лупачы Мастоўскага раёну. У 1981 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага Дзяржаўнага універсітэту. Праводзіў археалагічныя раскопкі на Панямонні, у выніку якіх была напісаная і абароненая кандыдацкая дысертацыя (1988) і апублікавана манаграфія “Гарады і замкі Беларускага Панямоння. 14-18 ст.: планіроўка, культурны слой” (Мінск, 1991). У 90-я гг. Алесь Краўцэвіч заняўся даследаваннем пачатковай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. У 1998 г. выйшла з друку ягоная манаграфія “Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага” (Мінск), а праз год была абароненая доктарская дысертацыя.

Другая палова 90-х гг., калі адбывалася афармленне і ўмацаванне аўтарытарнага рэжыму, сталася сур’ёзным выпрабаваннем як прафесіяналізму, так і чалавечай годнасці беларускіх гуманітарыеў. Не ўсе калегі-гісторыкі, якія калісьці аднадушна падтрымлівалі нацыянальна-дзяржаўнае Адраджэнне пачатку 90-х гг. і актыўна працавалі дзеля развіцця беларускай гістарычнай навукі, вытрымалі выпрабаванне часам і рэжымам. Некаторыя сталі адкрыта падтрымліваць рэжым, знайшлі ўтульныя пасады ў дзяржаўнай сістэме вышэйшай школы, сталі адміністратарамі. Іншыя



А. Краўцэвіч падчас прэзентацыі «Гістарычнага альманаха»

дзеля цёплага месца каля кармушкіператварыліся з гісторыкаў у прававерных рэжымных ідэолагаў і дэманструюць поўную лаяльнасць да ўсіх дзеянняў чыноўнікаў і адміністратараў. Алесь Краўцэвіч захаваў нязменнай сваю пазіцыю. Характэрнай рысай ягонага жыцця і дзейнасці з'яўляецца прынцыповасць у абароне нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі і беларускай мовы. Ён належыць да ліку найбольш вядомых навукоўцаў і грамадскіх дзеячоў Гарадзеншчыны.

З 1999 г. Алесь Краўцэвіч узначальвае Беларускае гістарычнае таварыства (БГТ), якое стала арганізатарам шэрагу буйных міжнародных навуковых канферэнцый. З 1998 г. ён з'яўляецца рэдактарам "Гістарычнага альманаха" (выйшла 13 томаў). Дзейнасць БГТ і выданне "Гістарычнага альманаху" – гэта без перабольшвання значны ўнёсак у развіццё беларускай гістарычнай навукі, у яе супрацьстаянне афіцыйнай ідэалогіі, якая намагаецца пазбавіць нацыю гістарычнай памяці.

Археолаг і гісторык актыўна ўдзельнічае ў грамадскіх акцыях пратэсту супраць "рэканструкцыі па-гарадзенску", г.зн. супраць руйнавання гістарычнага цэнтру Горадні і знішчэння ягонай гістарычнай і культурнай адметнасці.

Хочацца пажадаць Алесю Краўцэвічу захаваць творчую энергію, рашучасць характару, і, нарэшце, мужчынскую абаяльнасць і на наступныя 50 гадоў жыцця.

Рэдакцыя